Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гарк(ому Каму)ністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдання—XV
№ 247 (4152)
ПЯТНІЦА, 11 верасьня
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАЛЫНКА

Аб разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю ў калгасах у 1931 г.

Пастанова Наркамзему і Калгасцэнтру БССР

Правільнае разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю ў калгасах па колькасьці і якасьці працы мае рашаючае значэньне ў справе замацаваньня ўжо дасягнутых посьпехаў у калгасным будаўніцтве і далейшым пашырэньні і ўзмацненьні калгаснага руху. Толькі своечасовае і правільнае разьмеркаваньне даходаў у калгасах замацоўвае зьдзельшчыну, узьнімае прадукцыйнасьць працы, павялічвае таварнасьць калгаснай гаспадаркі і палепшае матар'яльнае і культурнае становішча калгасьнікаў.

Між тым, пастанова Наркамзему і Калгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні даходаў у калгасах у 1931 годзе, у якой паказаны прынцыпы і парадак разьмеркаваньня, яшчэ не ва ўсіх калгасах абгаворана і не даведзена да кожнага калгасьніка і калгасьніцы. Калгасаводы і калгасы фактычна яшчэ не прыступілі да падліку і папярэдняга разьмеркаваньня ўраджаю ў калгасах. Таму ў развіцьцё і дапаўненьне пастановы Наркамзему і Калгасцэнтру СССР ад 12 ліпеня 1931 г. аб прыкладным разьмеркаваньні даходаў у калгасах—Наркамзем і Калгасцэнтр БССР абавязваюць земаддзелы, праўленьні калгасаводаў, МТС і праўленьні калгасаў у аснову работы па разьмеркаваньні даходаў у 1931 годзе пакласьці наступнае:

1. Тэрміны і парадак разьмеркаваньня даходаў у калгасах

1. На аснове дакладных падлікаў сабранага ўжо ўраджаю, атрыманых даходаў і папярэдніх падлікаў рэшты ўраджаю, а таксама і іншых даходаў, якія калгас мяркуе атрымаць да 1-га студзеня 1932 г., ва ўсіх калгасах павінны быць складзены папярэднія пляны разьмеркаваньня даходаў і абавязкова абгаворваны ў брыгадах, на шырокіх нарадах калгасьнікаў і калгасьніц, калгасным актыве, праведаны рэвізійнымі камісіямі і зацьверджаны агульнымі сходамі калгасьнікаў.

2. Пры абгаворэньні плянаў разьмеркаваньня ў кожным калгасе неабходна падагуліць вынікі зьдзельшчыны, як выконваюцца нормы выпрацоўкі, ці наладжан і як праводзіцца ўлік праробленай працы кожным калгасьнікам і ацэнка працы ў працадзён, ці зьмяшчана аблязічка як у працы так і ў карыстаньні інвэнтаром з тым, каб усе выяўленыя недахопы былі канчаткова ліквідаваны, не дапускаючы ні ў якім разе памылак мінулага году, як:

а) разьмеркаваньне даходаў па адказках, а не па колькасьці і якасьці працы;

б) папярэдняя выдача грашовых і натуральных авансаў калгасьнікам, з прычыны заблытанасьці ўліку даходаў і адсутнасьці правільнага ўліку працы калгасьнікаў;

в) невыстарчальны ўдзел саміх калгасных мас у абгаворэньні і прапрацоўцы плянаў разьмеркаваньня;

г) зацяжка самога разьмеркаваньня і інш.

3. Уся работа па складаньні і зацьвярджэньня плянаў разьмеркаваньня павінна праводзіцца з такім разьлікам, каб на ўсіх калгасах, згодна вызначанага разьмеру даходаў, якія павінны быць разьмеркаваны сярод калгаслікаў, была выдана аднаведная выпрацаванай ім колькасьці працадзён да 15 кастрычніка палова ўсіх даходаў, аднак, ня больш $^2/_3$, а рэшта даходаў пры канчатковым разьліку не пазьней 15 студзеня 1932 году.

4. Разьмеркаваньне даходаў ва ўсіх калгасах павінна быць поўнасьцю скончана не пазьней 15 студзеня 1932 году, да гэтага часу ва ўсіх калгасах павінны быць:

а) канчаткова ўдасканалены разьмеры валавога даходу калгасаў і дакладна падлічаны ўсе прадукты, выпрацаваныя калгасьнікамі ў 1931 годзе і запісаныя ў іх працоўныя кніжкі, а таксама ўсе авансы, выданыя ў лік выпрацаваных працадзён;

б) праведзены канчатковы разьлік з калгасьнікамі па долі даходу, якая ім прыпадаецца як натуральная, так і грашовай часткай за ўвесь 1931 год. Пры канчатковым разьліку з калгасьнікамі ў канцы году ўлічваць раней выданыя як натуральныя, так і грашовыя авансы;

в) поўнасьцю пакрыты ўсе абавязковыя абавязацельствы калгасаў ва ўстаноўленыя тэрміны па с.-г. падатку, страхоўцы, крэдытах і г. д.;

г) створаны калгасныя фонды: непадзельны для разьмеркаваньня на аграмаджанай маемасьці, культурна-бытавы, прэміяльны і фонд для агра-вытворчага абслугоўваньня калгасаў.

5. Не пазьней 31 студзеня 1932 году праўленьні калгасаводаў павінны даў калгасамі.

дасылаць Калгасцэнтру канчатковыя справаздачы аб разьмеркаваньні даходаў і парадак разьмеркаваньня, якія маюць малую колькасьць працаздольных і, ня гледзячы на сваю добрасумленную работу, ня выпрацавалі колькасьці працадзён, неабходнай для забесьпячэньня сям'і прадуктамі харчаваньня;

в) для забесьпячэньня адыходнікаў і ім сем'яў, якія ня выпрацавалі неабходнай для іх колькасьці харчоў, з прычыны малой колькасьці ў сям'і працаздольных, з такім разьлікам, каб адыходнікі і іх сем'і атрымалі харчоў столькі, колькі атрымлівае калгасьнік, які добрасумленна працуе ў калгасе. Калі працаздольныя члены сям'і адыходнікаў адмаўляюцца зусім ад работы ў калгасе, або сыстэматычна прымаюць невыстарчальны ўдзел у рабоце, дык сям'я адыходнікаў гэтай ільготай по карыстаецца і нічога апрача таго, што ёю выпрацавана па працадзёх, не атрымлівае;

г) выдача прадуктаў харчаваньня ўсім пералічаным у п. 4, № «а», «б» і «в» праводзіцца па мясцовых дзяржаўных цэнах, аднак, у выпадку вялікай патрэбы асобных сем'яў калгасьнікаў, якія добрасумленна працавалі ў калгасе і маюць вялікую колькасьць непрацаздольных, харчовыя прадукты са спэцыяльнага харчовага фонду, па пастанове агульнага сходу калгасьнікаў, могуць быць выданы ў парадку выключэньня бясплатна. Гэтыя выдаткі спісваюцца з даходаў калгасу, як беззваротныя выдаткі гаспадаркі.

д) Уся маса харчовых прадуктаў, за вылікам зданай (праданай) па загатоўках, адкладзенай у насенны, страхавы і спэцыяльныя харчовы фонды, разьмяркоўваюцца паміж калгасьнікамі па колькасьці і якасьці працы, згодна выпрацаваных працадзён, якія запісаны ў працоўных кніжках калгасьнікаў.

е) Калі калгасьнік, працуючы добрасумленна на працягу году, выпрацаваў шмат працадзён, і харчовыя прадукты, якія належаць да атрыманьня такім калгасьнікам у лік выпрацаваных працадзён перавышаюць уласную патрэбу гэтых калгасьнікаў і іх сем'яў у харчох, дык лішак гэтай прадукцыі павінны быць здан калгасьнікамі ў арганізаваным парадку праз калгас аднаведным дзяржаўным або каапэрацыйным арганізацыям, а калгасьнікі за праданыя ім лежачыя ім лішкі атрымліваюць грошы і прамтавары.

7. На падставе папярэдняга плян разьмеркаваньня даходаў у калгасах, п меры выкананьня пляну ўборкі і здач па загатоўках, калгасьнікам выдаюцц авансы харчовымі прадуктамі ў лік выпрацаваных ім працадзён. Выдача аванс саў павінна праводзіцца ў наступны парадку:

а) з агульнай колькасьці сабранай ур харчовай прадукцыі ў часе правядзен ня папярэдняга разьмеркаваньня ўраджаю, праўленьне калгасу вызначае ч стку для авансаваньня калгасьніка разьмеры якое ні ў якім разе не павінн перавышаць $^2/_3$ таго, што па папярэ нім падліку павінна быць разьмеркав на паміж калгасьнікамі;

б) вызначыўшы пэўную колькасьн харчовай прадукцыі для авансаваньн калгасьнікаў, праўленьне калгасу, в падставе дасканалага падліку выпрацаваных усімі калгасьнікамі да часу р дачы авансаў працадзён, устанаўл колькасьць харчовай прадукцыі, яка прыпадае ў якасьці авансу на 1 прац дзень;

в) вызначаныя для разьмеркаваньн ў якасьці авансаў паміж калгасьніка харчы разьмяркоўваюцца па колькасьц выпрацаваных кожным калгасьніка працадзён;

г) праўленьні калгасаў могуць не вы даваць авансаў тым калгасьнікам, якія дрэнна працуюць і ня выконваюць з даньня праўленьняў, а аддкладваюц разьлікі з гэтымі калгасьнікамі да скан чэньня ўсіх работ.

8. Пасьля выдачы авансаў у кожны калгасе павінны вывешвацца сьпіс калгасьнікаў з паказаньнем, колькі кожны калгасьнік або калгасная сям'я вы працавалі працадзён і які разьмер аван саў у аднаведнасьці з гэтымі яны атрымалі.

2. Арганізацыя ўліку

1. Правільна разьмеркаваць даходы немагчыма без дакладнага ўліку ўсіх даходаў і расходаў калгасаў, а таксама затрачанай кожным калгасьнікам і ўсіх выданых авансаў як грашыма, так і натурай. Таму не пазьней 20 верасьня г. г. праўленьні калгасаў абавязаны закончыць падлік і запіс у аднаведныя кнігі ўсяго сабранага ўраджаю і атрыманых даходаў. Ураджай ад нізбраных да часу складаньня пляну разьмеркаваньня культур, вылічваецца арыентовачна, як і іншыя даходы гаспадаркі, і разьмер валавога даходу канчаткова ўдасканальваецца ў канцы справаздачнага году пры канчатковым разьліку. Натуральная частка даходаў калгасаў улічваецца як вагою, так і ў грашовых ацэнках па мясцовых дзяржаўных загатоўчых цэнах.

2. Да 20 верасьня праўленьні калгасаў абавязаны падлічыць усе выдаткі калгаснай гаспадаркі.

а) сумы с.-г. падатку і страхоўкі, налічаныя і якія павінны быць выплачаны кожным калгасам у 1931 годзе;

б) плацяжы па крэдытах, якія патрэбна пагасіць у 1931 годзе;

в) вытворчыя, адміністрацыйна-гаспадарчыя і агульныя выдаткі калгаснай гаспадаркі, як: кошт набытых за ўласныя грошы калгасу сродкаў вытворчасьці для вядзеньня гаспадаркі калгасу ў бягучым 1931 годзе—дробны інвэнтар, насеньне, утаеньне, гаручыя, смазачныя і інш. матар'ялы, плата за работу МТС, аплата наёмных спэцыялістаў, купля акцый Трактарацэнтру, аплата машынных абавязацельстваў, купля дзяржаўных пазык, узносы ў фонд доўгатэрміновага крэдытаваньня калгасаў, купля форм уліку, паштовыя і канцылярскія выдаткі калгасу.

3. Не пазьней 20 верасьня ў кожным калгасе павінны быць падлічаны ўсе прадукты, выпрацаваныя кожным калгасьнікам на працягу гэтага году, у тым ліку па азімым засеве, зяблеве, пры пасадцы шматгадовых насажденьняў і будаўніцтве. Да гэтага часу павінны быць падлічаны таксама ўсе выданыя авансы як грашыма так і натурай. Усе гэтыя падлікі і кніжныя запісы павінны быць праверены рэвізійнымі камісіямі калгасаў і перанесены ў членскія кніжкі калгасьнікаў з тым, каб кожная калгасная сям'я і кожны калгасьнік ведалі аб колькасьці цыпрацаваных імі працадзён і разьмеры атрыманага імі авансу.

4. У далейшым усе запісы ў працоўныя кніжкі калгасьнікаў павінны праводзіцца не радзей аднаго разу ў жыцідзёўку. У канцы кожнага месяца рэвізійныя камісіі калгасаў павінны праверыць правільнасьць запісаў працадзён у працоўных кніжках і сачыць за тым, каб гэтыя запісы і авансы пераносіліся ў членскія кніжкі калгасьнікаў.

5. На падставе вытворчых і рабочых плянаў у кожным калгасе павінен быць праведзен папярэдні падлік працадзён, якія будуць выпрацаваны калгасьнікамі ад часу складаньня пляну разьмеркаваньня даходаў да канца году (да 1 студзеня 1932 году). Гэты падлік павінен удасканальвацца ў залежнасьці ад выкананьня вытворчага пляну і ўліку фактычна выпрацаваных кожным калгасьнікам працадзён.

3. Разьмеркаваньне валавога даходу і арганізацыя фондаў

1. З валавога даходу ў калгасе разьмеркаванаму паміж калгасьнікаў падлягае:

а) харчовае збожжа і іншыя прадукты, за выключэньнем тэй часткі, якая належыць здачы (продажу) па кантрактацыі і за выключэньнем насеннага, страхавога і спэцыяльных харчовых фондаў, якія ўтвараюцца паводле пастановы калгасьнікаў;

б) кармы, за выключэньнем тых, якія належаць здачы (продажу) дзяржаве, фуражных фондаў, якія пакідаюцца для таварных фэрм і аграмаджанай жывёлы калгасаў, і запасного фуражнага фонду для намечанага пашырэньня жывёлагадоўлі;

в) грашовы сродкі, за выключэньнем тых, якія належыць заплаціць за даўгі, с.-г. падатак і страхоўку, а таксама тых, якія пакідаюцца для забесьпячэньня пляну капітальнага будаўніцтва на куплю інвэнтару і матар'ялаў і для іншых выдаткаў, для вядзеньня гаспадаркі і адлічэньняў у спэцыяльныя і грамадзкія фонды.

2. Парадак адлічэньняў у непадзельныя і іншыя грамадзкія фонды ўстанаўляецца наступны: з агульнага даходу калгасаў робяцца адлічэньні насеннага і страхавога фондаў, фуражнага і запаснога фуражнага фондаў, сум, якія павінны пайсьці на выплату с.-г. падатку, страхоўкі і плацяжоў па крэдытах 1931 г. Пасьля паказаных адлічэньняў з сумы, даходаў калгасаў, якая засталася, стварацца непадзельны фонд, фонд для разьмеркаваньня паміж калгасьнікамі па кошце аграмаджанай маемасьці культурна-бытавы фонд, прэміяльны фонд і фонд для агра-вытворчага абслугоўваньня калгасаў.

3. Адлічэньні ў непадзельны фонд утвараюцца ў размеры 10 проц. у калгасах, якія арганізаваны пасьля 1 кастрычніка 1930 году і 15 проц. у калгасах, арганізаваных да 1 кастрычніка 1930 году. Непадзельны фонд прызначаецца для куплі машын, рабочай і прадукцыйнай жывёлы і на капітальнае будаўніцтва. Непадзельны фонд выдзяляецца ў грошах, пасьля разьмеркаваньня даходаў упосіцца ў банк на бягучы рахунак калгасу і выдаткуецца калгасам па простым прызначэньні.

4. Фонд для разьмеркаваньня паміж калгасьнікамі на кошце аграмаджанай маемасьці ствараецца ва ўсіх раёнах і калгасах БССР у разьмеры 3 проц. Пры разьмеркаваньні гэтага фонду паміж калгасьнікамі на кошце аграмаджанай маемасьці налічэньне на кошт прадукцыйнай аграмаджанай калгасьнікамі жывёлы праводзіцца ў падвойным разьмеры.

5. Фонд для прэміяваньня лепшых ударнікаў-калгасьнікаў ствараецца ў разьмеры 1 проц. і фонд для данамогі курсантам і вучням таксама ў разьмеры 1 проц.

6. Культурна-бытавы фонд ствараецца ў разьмеры 2 проц. і выдаткоўваецца на культурна-бытавое абслугоўваньне калгасьнікаў па плянах, складзеных культурна-бытавымі камісіямі калгасаў і зацьверджаных праўленьнем калгасаў.

7. Фонд для агра-вытворчага абслугоўваньня калгасу ствараецца ў разьмеры 1 проц. і ўносіцца ў касу калгасаводу, які і выдаткоўвае яго на агравытворчае абслугоўваньне калгасу.

8. Гэты парадак разьмеркаваньня валавога даходу ўстанаўляецца як для арцеляй, так і для камун.

4. Разьмеркаваньне харчовай часткі даходаў

Харчовая частка валавога даходу разьмяркоўваецца наступным чынам:

1) Калгас здае (прадае) загатоўчым арганізацыям усю прадукцыю, закантрактаваную па дагаварох, што належыць здачы паводле пляну, якія ўстаноўлены для кожнага калгасу ў паасобку.

2) Стварацца насенны фонд у такім разьмеры, які забясьпечвае пашырэньне пасеўнай плошчы на пляне, прынятым у калгасе на 1932 г., а пры адсутнасьці пляну ня менш, чым у разьмеры, які забясьпечвае пашырэньне пасеўнай плошчы ў параўнаньні з 1931 годам на 10-15 проц.

3) Стварацца страхавы фонд у разьмеры 15 проц. насеннага. Апрача таго, адлічацца аднаведная колькасьць насеньня для пагашэньня насенных пазычак мінулых гадоў, а таксама аднаўляецца страхавы фонд мінулага году, які скарыстоўваецца ў веснавую сяўбу.

4) Стварацца таксама спэцыяльны харчовы фонд:

а) для забесьпячэньня настаўнікаў, агрономаў, зоатэхнікаў, вэтдактароў, якія непасрэдна абслугоўваюць даны калгас і вызначаюцца членамі калгасу або знаходзяцца на рабоце ў калгасе ў якасьці наёмных спэцыялістаў, а таксама вылучэньні калгасьнікаў, працуючых на выбарчых пасадах старшынь сельсаветаў і спажыўтаварыстваў, сем'і якіх, ня гледзячы на сваю добрасумленную работу, ня выпрацавалі колькасьці працадзён, неабходнай для забесьпячэньня іх прадуктамі харчаваньня.

б) для забесьпячэньня сем'яў калгасьнікаў, якія маюць малую колькасьць працаздольных і, ня гледзячы на сваю добрасумленную работу, ня выпрацавалі колькасьці працадзён, неабходнай для забесьпячэньня сям'і прадуктамі харчаваньня;

в) для забесьпячэньня адыходнікаў і ім сем'яў, якія ня выпрацавалі неабходнай для іх колькасьці харчоў, з прычыны малой колькасьці ў сям'і працаздольных, з такім разьлікам, каб адыходнікі і іх сем'і атрымалі харчоў столькі, колькі атрымлівае калгасьнік, які добрасумленна працуе ў калгасе. Калі працаздольныя члены сям'і адыходнікаў адмаўляюцца зусім ад работы ў калгасе, або сыстэматычна прымаюць невыстарчальны ўдзел у рабоце, дык сям'я адыходнікаў гэтай ільготай по карыстаецца і нічога апрача таго, што ёю выпрацавана па працадзёх, не атрымлівае;

г) выдача прадуктаў харчаваньня ўсім пералічаным у п. 4, № «а», «б» і «в» праводзіцца па мясцовых дзяржаўных цэнах, аднак, у выпадку вялікай патрэбы асобных сем'яў калгасьнікаў, якія добрасумленна працавалі ў калгасе і маюць вялікую колькасьць непрацаздольных, харчовыя прадукты са спэцыяльнага харчовага фонду, па пастанове агульнага сходу калгасьнікаў, могуць быць выданы ў парадку выключэньня бясплатна. Гэтыя выдаткі спісваюцца з даходаў калгасу, як беззваротныя выдаткі гаспадаркі.

д) Уся маса харчовых прадуктаў, за вылікам зданай (праданай) па загатоўках, адкладзенай у насенны, страхавы і спэцыяльныя харчовы фонды, разьмяркоўваюцца паміж калгасьнікамі па колькасьці і якасьці працы, згодна выпрацаваных працадзён, якія запісаны ў працоўных кніжках калгасьнікаў.

е) Калі калгасьнік, працуючы добрасумленна на працягу году, выпрацаваў шмат працадзён, і харчовыя прадукты, якія належаць да атрыманьня такім калгасьнікам у лік выпрацаваных працадзён перавышаюць уласную патрэбу гэтых калгасьнікаў і іх сем'яў у харчох, дык лішак гэтай прадукцыі павінны быць здан калгасьнікамі ў арганізаваным парадку праз калгас аднаведным дзяржаўным або каапэрацыйным арганізацыям, а калгасьнікі за праданыя ім лежачыя ім лішкі атрымліваюць грошы і прамтавары.

7. На падставе папярэдняга пляну разьмеркаваньня даходаў у калгасах, п меры выкананьня пляну ўборкі і здач па загатоўках, калгасьнікам выдаюцц авансы харчовымі прадуктамі ў лік выпрацаваных ім працадзён. Выдача аванс саў павінна праводзіцца ў наступны парадку:

а) з агульнай колькасьці сабранай ур харчовай прадукцыі ў часе правядзен ня папярэдняга разьмеркаваньня ўраджаю, праўленьне калгасу вызначае ч стку для авансаваньня калгасьніка разьмеры якое ні ў якім разе не павінн перавышаць $^2/_3$ таго, што па папярэ нім падліку павінна быць разьмеркав на паміж калгасьнікамі;

б) вызначыўшы пэўную колькасьн харчовай прадукцыі для авансаваньн калгасьнікаў, праўленьне калгасу, в падставе дасканалага падліку выпрацаваных усімі калгасьнікамі да часу р дачы авансаў працадзён, устанаўл колькасьць харчовай прадукцыі, яка прыпадае ў якасьці авансу на 1 прац дзень;

в) вызначаныя для разьмеркаваньн ў якасьці авансаў паміж калгасьніка харчы разьмяркоўваюцца па колькасьц выпрацаваных кожным калгасьніка працадзён;

г) праўленьні калгасаў могуць не вы даваць авансаў тым калгасьнікам, якія дрэнна працуюць і ня выконваюць з даньня праўленьняў, а аддкладваюц разьлікі з гэтымі калгасьнікамі да скан чэньня ўсіх работ.

8. Пасьля выдачы авансаў у кожны калгасе павінны вывешвацца сьпіс калгасьнікаў з паказаньнем, колькі кожны калгасьнік або калгасная сям'я вы працавалі працадзён і які разьмер аван саў у аднаведнасьці з гэтымі яны атрымалі.

5. Разьмеркаваньне кармовай прадукцыі

1. Кармовая прадукцыя калгасаў разьмяркоўваецца так:

а) выконваецца плян здачы (продажу) дзяржаве кармоў па плянах загатовак, устаноўленых для кожнага калгасу ў паасобку;

б) ствараецца фуражны фонд грубых і канцэнтраваных кармоў для поўнага забесьпячэньня патрэбнасьці таварных калгасных фэрм, рабочай і аграмаджанай пардукцыйнай жывёлы калгасаў, асабліва на гадоўлю маладняка і запасны фуражны фонд для намечанага пашырэньня жывёлагадоўлі як у таварных калгасных фэрмах, так і іншай аграмаджанай жывёлы. З фонду, прызначанага для аграмаджанай жывёлы, павінна быць вылучана недатыкальная частка для рабочай жывёлы на час падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы, якая захоўваецца асобна і выдаткоўваецца толькі з пачаткам веснавых палявых работ.

Кармы, вызначаныя для таварных калгасных фэрм, браніруюцца за таварнымі фэрмамі і могуць выдаткоўвацца толькі на патрэбы фэрмы;

в) ствараецца спэцыяльны кармовы фонд для забесьпячэньня кармамі жывёлы калгасьнікаў-адыходнікаў, сем'і якіх, з прычыны невыстарчальнай колькасьці працаздольных, ня выпрацавалі колькасьці працадзён, неабходнай для атрыманьня кармоў у разьмеры, які забясьпечвае іх жывёлу. Разьмер гэтага фонду павінен быць такім, каб адыходнікі атрымалі кармоў столькі для жывёлы, колькі атрымае калгасьнік, які добрасумленна працуе ў калгасе. Калі працаздольныя члены сям'і адыходнікаў адмаўляюцца зусім ад работы ў калгасе або сыстэматычна прымаюць невыстарчальны ўдзел у рабоце пры наяўнасьці выстарчальнай колькасьці працаздольных, дык сям'я адыходніка гэтай ільготай не карыстаецца і атрымлівае кармы для жывёлы толькі ў тэй колькасьці якая прыпадае на выпрацаваныя членамі сям'і адыходніка працадні. Кармы з гэтага фонду для жывёлы адыходнікаў адпускаюцца за наяўны рахунак на ўстаноўленых дзяржаўных цэнах;

г) усе кармы, якія застаюцца пасьля выкананьня пляну загатовак, стварэньня фуражнага, запаснога і спэцыяльнага кармовых фондаў, разьмяркоўваюцц паміж калгасьнікамі, якія маюць прадукцыйную жывёлу на колькасьці выпрацаваных калгасьнікамі працадзён і улікам наяўнасьці ў калгасьніка прадукцыйнай жывёлы;

д) калгасьнікі, якія ня маюць прадукцыйнай жывёлы, атрымліваюць належачую ім долю даходаў замест фуражу грашыма;

е) калгасьнік, які завядзе прадукцыйную жывёлу пасьля разьмеркаваньня ўраджаю, можа атрымаць неабходную колькасьць кармоў за плату па дзяржаўных цэнах, аднаведна выпрацаванай ім колькасьці працадзён, з запаснога фуражнага фонду на асобнай пастанове праўленьня калгасу.

6. Разьмеркаваньне грашовай часткі даходаў

1. Грашовы даход калгасаў складаецца з:

а) здачы (продажу) дзяржаве харчовай, кармовай і іншай прадукцыі, у тым ліку ад рэалізаванай прадукцыі таварных фэрм;

б) кошту выданай прадукцыі са спэцыяльнага харчовага фонду і кармовага фонду;

в) даходаў ад прамысловых і падсобных прадпрыемстваў;

г) даходаў ад паасобных заработкаў;

д) іншых грашовых даходаў калгасаў.

2. Крэдыты і грашовыя авансы па кантрактацыі ў грашовы даход, які падлягае разьмеркаваньню, ня ўключаецца.

3. Грашовыя даходы калгасу павінны разьмяркоўвацца наступным чынам:

а) выплачваецца с.-г. падатак, страхоўка і іншыя абавязковыя плацяжы;

б) пагашаюцца пазыкі па крэдытах, якія неабходна аплаціць у 1931 годзе;

в) утрымліваюцца спэцыяльныя і грамадзкія фонды, якія ствараюцца згодна §§ 2, 3, 4, 5 і 6 разьдзелу 3;

г) пагашаюцца вытворчыя, адміністрацыйна-гаспадарчыя і агульныя выдаткі калгасу;

д) уся рэшта сумы пасьля правядзеньня гэтых адлічэньняў разьмяркоўваецца паміж калгасьнікамі аднаведна колькасьці працадзён, выпрацаваных кожным калгасьнікам і запісаных у яго працоўную кніжку.

7. Арганізацыйныя мерапрыемствы

1. Уся работа па падрыхтоўцы і разьмеркаваньні даходаў павінна праводзіцца пры актыўным удзеле ўсіх калгасьнікаў і калгасьніц. Папярэднія і канчатковыя пляны разьмеркаваньня павінны быць шырока абгаворваны і зацьверджаны агульным сходам.

ІКЗ і Калгасцэнтр БССР папярэджваюць усе праўленьні калгасаў, калгасаводы і зямельныя аддзелы і МТС супроць спроб разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю калгасаў праводзіць адміністрацыйным парадкам, падмяняючы актыўнасьць і самадзейнасьць шырокіх калгасных мас.

2. Папярэднія і канчатковыя вынікі разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў у калгасах трэба ставіць на абгаворэньне ня толькі агульных сходаў калгасьнікаў, але і на шырокіх сходах беднякоў і сярэднякоў — аднаасобнікаў з тым, каб на аснове даных разьмеркаваньня даходаў у калгасах паказаць аднаасобнікам усе неравагі буйной калектыўнай гаспадаркі перад дробнай аднаасобнай.

3. Наркамзем і Калгасцэнтр БССР абавязваюць калгасаводы, зямельныя аддзелы і МТС для аказаньня рэальнай дапамогі праўленьням калгасаў і кіраўніцтва ў справе падрыхтоўкі і разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў прымацаваць да групы 5-10 калгасаў па адным адказным работніку са складу зямельнага аддзелу, калгасаводу і МТС і іншых раённых арганізацый, якія добра вывучылі прынцыпы і тэхніку разьмеркаваньня даходаў, усклаўшы на іх адказнасьць за правядзеньне работ па падрыхтоўцы і разьмеркаваньні даходаў у прымацаваных калгасах.

4. Абавязаць зямельныя аддзелы, калгасаводы і МТС вылучыць у кожным сельсавеце па адным апорным калгасе, пераважна спэцыялізаваных, і правесьці ў гэтых калгасах у першую чаргу работу па папярэднім разьмеркаваньні ўраджаю з тым, каб на іх вопыце арганізаваць работу ў іншых калгасах раёну.

5. Даручыць калгасаводам скарыстаць усіх грамадзкіх па-за штатных інструктароў і дадаткова вылучыць са складу старых калгасаў лепшых калгасьнікаў-ударнікаў, якія добра зразумелі прынцыпы і тэхніку правільнага разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю, у якасьці грамадзкіх інструктароў з такім разьлікам, каб на кожныя 5 калгасаў прыходзілася ня менш, як па адным інструктары.

6. Наркамзем і Калгасцэнтр БССР на пярэджваюць зямельныя аддзелы, калгасаводы, МТС і праўленьні калгасаў што затрыманьне з разьмеркаваньнем ураджаю і даходаў, адсутнасьць і дрэнны ўлік ураджаю і асабліва колькасьці і якасьці выпрацаваных калгасьнікам працадзён, а таксама невыстарчальна правядзеньне растлумачальнай работы сярод шырокіх мас калгасьнікаў будуц разглядацца, як самае цяжкае злачынства, накіраванае на зрыў справы правільнага разьмеркаваньня даходаў ураджаю, і як дапамога кулаку ў яго рабоце супроць непераможнага калгаснага руху.

7. Наркамзем і Калгасцэнтр БССР пад крэсьліваючы, што толькі правільна разьмеркаваньне даходаў у калгасах уэмоціць зьдзельшчыну і завершыць вялізарную работу, праробленую ў час веснавой і ўборачнай кампаніі, яшчэ раз напамінае ўсім калгасьнікам і калгасьніцам што толькі на аснове правільнага разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю на працадзёх, на аснове зьдзельшчыны, будзе нанесен рашучы ўдар кулаку і яго імкненьням разбурыць калгасы шляхам разьмеркаваньня даходаў на ядоцкай уравнілаўскай сыстэме. Толькі на аснове правільнага разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю, будзе дадзей разгортвацца непераможны калгасны рух, будзе сапраўды дасягнута гасударчае ўзмацненьне калгасаў.

НАРОДНЫ КАМІСАР ЗЯМЛЯРОБСТВА РАЧЫЦКІ.
СТАРШЫНЯ КАЛГАСЦЭНТРУ БССР КОЎ.

УБРАЦЬ І АПРАЦАВАЦЬ ЛЁН

ЦЕРАБЛЕНЬНЮ ІЛЬНУ—
ударныя тэмпы перадавікоў

25 РАЁНАЎ ЗАКОНЧЫЛІ УБОРКУ

Не адставаць з ачосам, абмалотам і расьцілам

5-е верасьня — апошні тэрмін цераблення ільну на БССР.

Гэту дырэктыву партыі і ўраду **ВЫКАНАЛІ ТОЛЬКІ 25 РАЁНАЎ, ЯКІЯ ЎЖО ПОЎНАСЬЦЮ СКОНЧЫЛІ ЎБОРКУ ІЛЬНУ.**

Вось гэтыя раёны: **Брагінскі, Буда-Кашалёўскі, Веткаўскі, Жлобінскі, Карманскі, Камарынскі, Ельскі, Лоеўскі, Любаньскі, Лельчыцкі, Нарэўлянскі, Рагачоўскі, Рэчыцкі, Спуцкі, Старобінскі, Церахаўскі, Чачэрскі, Чырвонапольскі, Уваравіцкі, Хойніцкі, Бярэзінскі, Клімавіцкі, Клічаўскі, Крычаўскі, Менскі, Сеньненскі.**

У аспоўным скончылі ўборку ільну **Мазырскі, Пятрыкоўскі, Асіпавіцкі, Бялыніцкі, Смалявіцкі, Чэрвеньскі, Чавускі, Гарадоцкі, Лёзьнянскі і Лепельскі раёны.** У гэтых раёнах ужо ўбрана ад 98 да 99 проц. ільнапасеваў.

Апошняя пяцідзёўка ня дала належнага павышэньня тэмпаў на ільнішчах. За пяць дзён убрана **усяго 10,3 проц.** агульнага пляну ў той час, як чацьвертая пяцідзёўка дала 23,1 проц. прыросту, а пятая—18,7 проц.

НА 5 ВЕРАСЬНЯ ПА БССР УБРАНА 89,5 ПРОЦ. ІЛЬНАПАСЕВАЎ.

Рад раёнаў, як **ГЛУСКІ, СТАРАДОРСКІ, БЫХАЎСКІ І КАПЫЛЬСКІ,** на вугл паратылі крыху адпачыць і за апошнія 5 дзён **НЯ ВЫЦЕРАБІЛІ НІ АДНАГО ГЭКТАРА ІЛЬНУ.**

Гомельскі і Барысаўскі раёны ўбралі за пяцідзёўку: першы — 0,6 проц., і другі—0,7 проц. Барысаўскі раён, які ў папярэднюю пяцідзёўку паказаў саграўды сальтавіцкія тэмпы ўборкі — 15,6 проц., у апошнія 5 дзён зноў ганебна адстае.

Усё яшчэ адстаюць такія раёны, як **Бабруйскі, Быхаўскі, Ельскі, Гарацкі, Заслаўскі, Койданаўскі і Чашніцкі.**

Горш за ўсё ідзе цераблеьне ільну ў **БЯГОМЛЬСКІМ І ПЛЕШЧАНІЦКІМ** раёнах, якія яшчэ на ўбралі **НАВАТ І ПАЛОВЫ** сваіх ільнапасеваў.

Той факт, што 50 раёнаў БССР не закончылі да тэрміну поўнасьцю ўборку ільну, а таксама вялізнае тэмпаў уборкі за апошнюю дэкаду сведчыць аб тым, што раённыя арганізацыі ня вядзелі яшчэ **ПРАВІЛЬНА АРГАНІЗАВАЦЬ ПРАЦУ НА ІЛЬНІШЧАХ,** максімальна скарыстаць усю наяўную рабочую сілу калгасаў, сапраўды **ЎКАРАЯЦЬ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ.**

Далейшага адставаньня з уборкай ільну **БОЛЬШ НЕЛЬГА ЦЯРПЕЦЬ.**

Калгасы, якія скончылі ўборку ільну, павінны зараз дапамагчы адстаючым. Арганізацыя калгаснай узаемадапамогі—лепшы сродак для хутчэйшага сканчэньня ўборкі.

У БЛІЖЭЙШЫЯ 5 ДЗЁН калгасы, саўгасы і раёны павінны рапартаваць партыі **АБ ПОЎНЫМ СКАНЧЭНЬНІ ЎБОРКІ ІЛЬНУ.**

Разрыў паміж цераблеьнем і апрацоўкай ільну яшчэ **НЕ ЛІКВІДАВАНЫ.** На 5 верасьня абмалочана **54,4 ПРОЦ.** убранага ільну, замочана і разаслана **47,4 ПРОЦ.**

Толькі тры раёны — **ЕЛЬСКІ, ЧАЧЭРСКІ І КАСЬЦЮКОВІЦКІ** — здолелі правільна паладзіць **ІЛЬНЯНЫ КАНВЭР.** Гэтыя раёны ўжо **поўнасьцю абмалаціні, замачылі і разаслалі ўбраны імі лён.**

Гэты разрыў паміж цераблеьнем і пераапрацоўкай ільну неабходна як можна хутчэй ліквідаваць. Усю рабочую сілу, якая вызваляецца ад уборкі, трэба **БЕЗАДКЛАДНА ПЕРАКЛЮЧЫЦЬ** на абмалот, мачэньне і сланьне ільну.

Толькі арганізацыяй **ІЛЬНЯНОГА КАНВЭРУ** мы здолеем **СВАЯЧАСОВА** убраць, апрацаваць і здаць лён дзяржаве.

ЗВОДКА

аб ходзе ўборкі і першапачатковай апрацоўкі ільну і ўборкі яравых збожжавых на 5 верасьня 1931 г.

Назва раёнаў	Уборка і апрацоўка ільну: Проц. выканаўня	Абмалоч. да выцерабл. у проц.	Проц. замоч. і разасл. да выцерабл.	Уборка яравых збожжавых Проц. выканаўня
Брагінскі	100	49,0	49,0	100
Б.-Кашалёўскі	100	75,7	75,7	96,9
Бабруйскі	85,5	75,8	75,8	92,6
Веткаўскі	100	16,8	16,8	85,6
Гдускі	78,6	49,7	49,7	74,8

Закончыць камплектаваньне сеткі партасьветы і сваячасова пачаць заняткі

„ІМКНЕНЬНЕ ПРАКТЫКАЎ АДМАХНУЦЦА АД ТЭОРЫІ СУПЯРЭЧЫЦЬ УСЯМУ ДУХУ ЛЕНІНІЗМУ“ (І. СТАЛІН)

Камвуз да навучальнага году не падрыхтаваўся

Навучальны год новага набору Камвузу павінен пачацца 1 КАСТРЫЧНІКА.

Аднак камплектаваньне КУБ праходзіць невыстарчальна. Замест 780 чалавек завербавана ўсяго 540. Некаторыя райкомы і гаркомы партыі проста ня хочуць адпускаць на вучобу камуністаў.

Зусім дрэнна стаіць справа з забесьпячэньнем новага набору інтэрнатамі і навучальным памяшканьнем. Гаспадарчыя арганізацыі Камвузу спадзяючыся на самацёк, на правялі ініцыятывы ў справе падрыхтоўкі інтэрнатаў для студэнтаў новага набору. Цэнтральныя арганізацыі г. Менску, ад якіх залежыць падрыхтоўка інтэрнатаў, таксама нічога не зрабілі.

НАРКАМАСЬВЕТЫ павінен аддаць памяшканьне дзяржаўнай бібліятэцы пад інтэрнат Камвузу, але і да сёньняшняга дня гэта не зроблена. Кіраўніцтва ГАРСАВЕТУ абмежавалася толькі пастановай аб адводзе Камвузу памяшканьня пад інтэрнат. БЕЛКЫЛСАЮЗ і МЕНБУД марудзяць з пабудовай стандартных дамоў для Камвузу.

Нельга моўчкі абыйсьці непаваротлівасьць і самога кіраўніцтва Камвузу ў пытаньні падрыхтоўкі да новага навучальнага году. Праграмы і навучальныя планы не падрыхтаваны.

Па гісторыі партыі, палітэканоміі і іншых дысцыплінах дагэтуль яшчэ няма праграм у той час, як старыя праграмы, асабліва па гісторыі клясавай барацьбы, палітэканоміі, зусім не падыходзяць, патрабуюць грунтоўнай перапрацоўкі.

Ні аднэй нарады выкладчыкаў па пытаньні падрыхтоўкі да новага навучальнага году яшчэ ня было. Катэдры ў Камвузе іс'ыюць фармальна, на самой па сабе нічога ня робяць, нават ня ведаюць сваіх функцый. Вельмі дрэнна стаіць справа з укамплектаваньнем Камвузу выкладчыкамі. Не хапае двух выкладчыкаў па палітэканоміі, аднаго па гісторыі народаў СССР. Зусім няма выкладчыкаў па спэцыяльных газэтных дысцыплінах. Адміністрацыя-к Камвузу нічога не зрабіла ў сэнсе забесьпячэньня гэтых дысцыплін выкладчыкамі Кіраўніцтва Камвузу не заняпося пытаньнем перабудовы навучальнай работы брыгад пачаткоўцу. ГАБІНЭТЫ, КАТЭДРЫ, ЯКІЯ ПАВІННЫ ЗАЙМАЦЦА ГЭТЫМ ПЫТАНЬНЕМ, НЕ ПРАЦУЮЦЬ.

Практыка студэнтаў пастаўлена вельмі дрэнна. У Камвузе прытрымліваюцца думкі, што практыкай павінен займацца толькі габінэт практыкі, таму ўсе іншыя катэдры і грамадзкія арганізацыі гэтым пытаньнем не займаюцца.

ЛЕЗУНГ ПАРТЫІ АБ АЎЛАДАНЬНІ ТЭХНІКАЙ У КАМВУЗЕ НЕ АЖЫЦЦЯЎЛЯЕЦЦА. Вельмі мала ўвагі аддаецца вывучэньню ВАЙСКОВАЙ СПРАВЫ. Пытаньні тэхнікі Чырвонай армії чамусьці праходзяць міма навучальных плянаў і праграм Камвузу.

Адміністрацыя Камвузу ня цікавіцца бытавымі ўмовамі студэнцтва. Калі ў мінулым годзе ня Камвуз была пазьня, цырульня, дым зараз усё гэта закрыта. Ніякай культмасавай работы сярод сем'яў студэнтаў не праводзіцца.

Зусім небясьпечнае становішча з АДСЕВАМ РАБОЧАЙ ПРАСЛОЙКІ. З 1-га курсу прыйму 1930 г. пакінула Камвуз 45 чал., што складае 18 проц. агульнага ліку студэнтаў 1-га курсу. Пры чым з выбыўшых 45 чалавек рабочых налічваецца 25 чал., што складае 60 проц. агульнага ліку рабочых на курсе.

Пры такім становішчы паўстае пагроза зрыву навучальнага году. Гэту пагрозу неабходна адвесьці.

Брыгада «ЗЬВЯЗДЫ» і шматтыражкі «ЛЕНІНЕЦ»: СКУРАТ, СЬЦЕПАНОВІЧ, КАЦНЭЛЬСОН, ТАМАШЭВІЧ, НОВІКАВА, ГЭЛІКМАН, НАРКО, ЛІУШЫЦ, ПЛІСКО, КАЗЯЛЕЦКІ, КРУЧКОЎ, АЛЯКСЕЕВА, НОВІК, ВАНЬКА ТЭМП, СТУДЭНТ МГ, РАЖАНЕЦ, НЯДБАЙЛА, КУНДАБІЦКІ, ШАТУН, ТАРТАКОЎСКАЯ, ЗЭЛЬЦАР.

Партгабінэты ў сыстэме партасьветы

Ва ўсёй сыстэме партасьветы, у работе па ўцягненьні тэарэтычнага ўзроўню шырокіх партыйных мас значную ролю кожны адыгрываць партгабінэты.

Партгабінэты ў некаторых раёнах за апошні час палепшылі сваю работу, многія з іх сваячасова разгарнулі падрыхтоўку да новага навучальнага году. Напрыклад, партгабінэт пры Чэрвеньскім райкоме прымаў практычны ўдзел у рабоце па разгортаньні партсеткі, выпрацоўцы мерапрыемстваў па арганізацыі і ўкамплектаваньні школ. Пры гэтым партгабінэце арганізавана метадбюро, якому дана заданьне падрыхтаваць праграму і мясцовы матар'ял для школ партасьветы.

Аднак, у большасьці партгарганізацый работу партгабінэтаў яшчэ недаацэньваюць, лічаць, што габінэт павінен адыграваць ролю бібліятэкі і больш нічога. Ня мала ёсьць выпадкаў, калі загадчыкаў партгабінэтаў адрываюць ад іх асноўнай работы. Такое становішча мае месца ў Пухавіцкім раёне, дзе райком партыі ня вірае работай партгабінэту і лічыць, што партсетка і партгабінэт —ня абязаныя паміж сабою галіны работы. Габінэт ня мае зараз загадчыка ў той час, як прапагандыст з адукаведнай асьветай «выкарыстоўваецца» на рабоце... у міліцыі.

На ленінскім працуе партгабінэт і ў Асіпавіцкім раёне. Загадчык партгабінэту пераатрыманы іншай работай, ня мае магчымасьці выконваць свае абавязкі.

Партарганізацыі павінны ведаць мэты і задачы партгабінэтаў, іх ролю ў партыйнай асьвеце. Трэба памятаць, што партгабінэты павінны зьяўляцца пунктамі па вывучэньні практыкі новых форм работы, пунктамі па зборы і сыстэматызацыі мясцовага матар'ялу і прыстасаваньні яго для партсетак. Партгабінэты зьяўляюцца важнейшым звяном у правядзеньні прапаганды за партвучобу і яе разгортваньні сярод шырокіх партыйных мас.

Асноўнымі задачамі партгабінэтаў павінны стаць:

Агітацыя за партвучобу, якая складаецца з рознастайных форм: загатоўка дыяграм, плякатаў, арганізацыя вечароў, цыкляў і г. д.

Габінэты сыстаматычна арганізуюць кансультацыі для дакладчыкаў, партактыву, арганізуюць семінары для прапасьдыстаў, аказваюць кансультацыйную дапамогу таварышом, якія займаюцца самаадукацыяй, завочнікам і інш.

Работу партгабінэтаў неабходна прыстасаваць да вытворчасьці, каб адпавядала ход выкананьня прамфінпляну прадпрыемства, калгасу, саўгасу, вылічаць чэрговыя гаспадарчыя задачы і г. д. У габінэтах павінна быць тэхнічная літаратура і арганізоўвацца распрацоўка і падбор праграм па прапрацоўцы тэхнічнага мінімуму ў партсетцы, а таксама ў розных тэхнічных гуртках і курсах. Габінэты павінны поўнасьцю падпарадкаваць сваю работу выкананьню чарговых гаспадарча-палітычных задач.

Да гэтага часу партгабінэты аддавалі невыстарчальную ўвагу самаадукацыі завочнікаў. Камвуз і завочная СПШ даюць завочнікам на чарговыя работы рацэнкі. Але сачыць за працэсам вучобы завочнікаў—гэтыя ўстановы ня маюць магчымасьці. Іх рабоце павінны дапамагаць партгабінэты.

Ва ўсёй рабоце партгабінэтаў неабходна праводзіць дыферэнцыацыю з тым, каб метады гэтай работы прыстасоўваць да пэўных катэгорый, якія абслугоўваюцца габінэтамі: пастаянных рабочых, сэзоннікаў, калгасьнікаў і г. д.

У тых раёнах, дзе да гэтага часу няма партгабінэтаў, райкомы партыі абязаны неадкладна прыступіць да іх арганізацыі, забясьпечыўшы арганізаваныя габінэты падрыхтаванымі загадчыкамі.

Удавічэнка.

Падрыхтоўка—на паперы

Партыйная вучоба ў **Крупскім** раёне ў мінулым годзе была сарвана.

Гэта асабліва абавязвае партыйную арганізацыю шырока разгарнуць работу па падрыхтоўцы да надыходзячага навучальнага году. Аднак, па справе гэтага мы ня маем. Недаацэнка партыйнай асьветы наглядаецца як у радзе ячэек, так і ў раённага парткіраўніцтва.

Яшчэ да гэтага часу не арганізаваны курсы па падрыхтоўцы прапагандыстаў. Прысланага з ЦК таварыша ў якасьці прапагандыста, райком прызначыў на іншую работу.

Ўся работа па разгортваньні сеткі партасьветы толькі і выявілася ў тым, што бюро райкому абмеркавала гэта пытаньне на сваім пасяджэньні і на гэтым абмежавалася.

М. І.

Задачы партасьветы не папулярызуюцца сярод мас

ЖЛОБІН. Падрыхтоўка да партвучобы ва ўсім раёне амаль што сарвана. Яшчэ не ўкамплектаваны дзесяціднёўныя курсы прапагандыстаў. Гэта ў той час, калі заняткі ў школах партасьветы павінны пачацца 15 верасьня.

Асабліва бязьдзейнасьць у галіне падрыхтоўкі да вучобы наглядаецца ў партыйным калектыве транспарту. Аб арганізацыі вагона партвучобы па прыкладзе Гомельскага вузла пакуль што толькі разважаюць.

За бязьдзейнасьць у падрыхтоўцы да вучобы райком зрабіў папярэджаньне сакратаром ячэйкі дэпо і райканторы.

Раённая партарганізацыя ва ўсіх зьвеньнях не праводзіцца растлумачальная работа аб задачах надыходзячага навучальнага году.

Арганізавалі праверку падрыхтоўкі да вучобы

ВІЦЕБСК. Падрыхтоўка да навучальнага году ў сетцы партасьветы праходзіць зусім незадавальняюча. Многія ячэйкі недаацэньваюць значэньня партвучобы. 18 парт'ячэек ня выдылучылі ні аднаго чалавека ў вячэрні камвуз.

Гарком прымаецца да парт'ячэек таварышоў для ўзмацненьня работы па разгортваньні сеткі партасьветы. Культпроп арганізуе перавірку ходу падрыхтоўкі да вучобы.

Дзень вучобы сарваны

ПУХАВІЧЫ. Дзень партвучобы 5 верасьня — ў Пухавіцкім раёне сарваны. Яшчэ да гэтага часу ні адна парт'ячэйка нічога не зрабіла ў справе камплектаваньня школ і палітгурткоў. Райком абмежаваўся толькі пастановай аб партыйнай асьвеце. Практычна - ж нічога не праводзіцца і ў гэтым напрамку.

Парт'ячэйка Калгасцэнтру бязьдзейнічае

Асеньняя сяўба, уборка, барацьба за тэхнічныя культуры і інш гаспадарча-палітычныя кампаніі высоўваюць цэлы рад практычных задач у сэнсе кіраўніцтва перад партыйнай арганізацыяй Калгасцэнтру. Аднак, парт'ячэйка Калгасцэнтру, у якой налічваецца 40 проц. работнікаў апарату, поўнасьцю бязьдзейнічае. На працягу некалькіх месяцаў ня было ніводнага пасяджэньня бюро. Адозву ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі ячэйка не прапрацоўвала. Сыстэматычна зрываюцца партыйныя сходы з прычыны няўкі партыйцаў.

Сакратар парт'ячэйкі тав. Паборцаў адгаворваецца тым, што людзі заняты, разьехаліся ў камандыроўкі.

Для ажыцьцяўленьня пастановы ЦК аб разьвіцьці жывёлагадоўлі па лініі Калгасцэнтру нічога ня зроблена.

Камсамольская ячэйка зусім не працуе. У апараце налічваецца 10 камсамольцаў; ёсьць 20 чалавек моладзі. Бязьдзейнічае ячэйка таму, што дагэтуль яшчэ ня выбран сакратар ячэйкі. Камсамольцы ня раз хадзілі ў гарком ЛКСМБ, у парт'ячэйку і дабіваліся, каб аформіць камсамольскую ячэйку пры Калгасцэнтры, але нічога не дабіліся.

Мясцкому фактычна ня існуе. Засталіся 2 члены мясцкому і тыя знаходзяцца ў доўгатэрміновай камандыроўцы. Прапрысцыпліна ў апараце занепала. Асобныя работнікі сыстэматычна спазьняюцца на работу.

Па пастанове Наркамзему і Калгасцэнтру СССР аб парадку разьмеркаваньня прыбыткаў ураджаю ў калгасах праўленьнем Белкалгасцэнтру яшчэ ў ліпені месяцы была вынесена пастанова, у якой даручана аднаму з членаў праўленьня тав. Залескаму (загадчыку вытворчага сэктару) практычна распрацаваць гэтае пытаньне, для чаго была вылучана камісія і спэцыяльны аграном, апошні цэлы месяц працаваў па калгасах, але ніякіх практычных вынікаў дагэтуль няма.

Наведвальнікі-калгасьнікі вельмі часта заставаюцца бяз усякіх адказаў таму, што аргсэктар заўсёды на замку.

Вынікі чысткі апарату Калгасцэнтру не прапрацаваны мясцкомам. Прапановы камісіі і пастановы РСІ па чыстцы апарату засталіся невыкананымі да гэтага часу.

К-н.

9.000 РАБОЧЫХ—ДАНБАСУ

Калгас імя Варашылава можа і павінен даць 15 чалавек, аднак, ён ня даў ні аднаго

Райкалгассаюзы, больш канкрэтнага кіраўніцтва вярбоўкай рабсілы для Данбасу!

ЧАЧЭРСК. У ЧАЧЭРСКІМ РАЁНЕ РАЗГАРНУЛАСЯ МАСАВА - РАСТЛУМАЧАЛЬНАЯ РАБОТА ПА ВЯРБОЎЦЫ. ВЫСУНУТ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН: ЗАМЕСТ КАНТРОЛЬНАЙ ЛІЧБЫ Ў 300 РАБОЧЫХ ВЫРАШАНА ЗАВЕРБАВАЦЬ 400. СТВОРАН ШТАБ САДЗЕЙНАСЬЦІ. ВЯРБОЎКАЙ АХОПЛЕНА 20 СЕЛЬСАВЕТАЎ І 41 КАЛГАС.

***

ГАРАДОК. ЯК ПАВЕДАМЛЯЕ ВЯРБОЎШЧЫК ХРУСТАЛЬСКАГА РУДАКІРАЎНІЦТВА, ВЯРБОЎКА РАСПАЧАЛАСЯ ДОВРА. 16 ВЕРАСЬНЯ МЯРКУЕЦЦА КАНТРОЛЬНЫХ 100 РАБОЧЫХ, 10 ВЕРАСЬНЯ — 30 РАБОЧЫХ. РАЕН, ЗГОДНА КАНТРОЛЬНАЙ ЛІЧБЫ, ПАВІНЕН ДАЦЬ 125 РАБОЧЫХ. ВЫСУНУТ СУСТРЭЧНЫ — 148, МЯРКУЕЦЦА ДАВЕСЬЦІ ДА 200, СКОНЧЫЎШЫ ВЯРБОЎКУ НА 5 ДЗЁН РАНЕЙ (25-IX). СПРЫЯЮЧЫЯ ЎМОВЫ ВЯРБОЎКІ ДАЮЦЬ МАГЧЫМАСЬЦЬ ПЕРАВЫКАНАЦЬ ЗАДАНЬНЕ. НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ ЗАВЕРБАВАНЫ 23 ЧАЛ.

***

РАГАЧОЎ. У РАГАЧОЎСКІМ РАЁНЕ ВЯРБОЎКА ІДЗЕ ГАНЕБНА ДРЭННА. НА 5 ВЕРАСЬНЯ ЗАВЕРБАВАНА ТОЛЬКІ 8 РАБОЧЫХ У ТОЙ ЧАС, ЯК КАНТРОЛЬНАЯ ЛІЧБА СКЛАДАЕ 200 ЧАЛАВЕК. РАЙКАЛГАССАЮЗ НЯ ДАЎ УКАЗАНЬНЯЎ КАЛГАСАМ АБ ВЯРБОЎЦЫ. ЁСЬЦЬ ВЫПАДКІ, ШТО КАЛГАСЫ НЕ АДПУСКАЮЦЬ ЖАДАЮЧЫХ ЕХАЦЬ Ў ДАНБАС. ТАК, **КАЛГАС ІМЯ ВАРАШЫЛАВА,** ЯКІ МОЖА ДАЦЬ 15 ЧАЛ., ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЯ ДАЎ НІ АДНАГО. **КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ МАЯК»** МОЖА ДАЦЬ 8 ЧАЛ., НЯ ДАЎ НІ АДНАГО. НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ **ДЗЯМІДАЎ** НІ СЛОВА НЕ СКАЗАЎ АБ ПАСЫЛЦЫ КАЛГАСЬНІКАЎ У ДАНБАС. КАЛГАСЫ **ЗАПОЛЬСКАГА** СЕЛЬСАВЕТУ ПАВІННЫ ДАЦЬ ДАНБАСУ 18 ЧАЛ.— НЕ ПАСЛАЛІ НІ АДНАГО.

***

КРУПКІ. РАЁН МАЕ ЗАДАНЬНЕ ЗАВЕРБАВАЦЬ ДЛЯ ДАНБАСУ 100 ЧАЛ. НА 9-ІХ АДПРАЎЛЕНА У ДАНБАС 30 ЧАЛ., З ІХ 7 КАЛГАСЬНІКАЎ, 2 КАМСАМОЛЬЦЫ. РЭШТА — ЛЕПШЫЯ САВЕТЫ РАЕНУ ЯШЧЭ НЕ ЎЗЯЛІСЯ ЗА РЭАЛІЗАЦЫЮ КАНТРОЛЬНАЙ ЛІЧБЫ ВЯРБОЎКІ **ПА - БАЛЬШАВІЦКУ.** У РАБОЦЕ ПАНУЕ САМАЦЁК. ТОЛЬКІ **ХАЛОПЕНІЦКІ** СЕЛЬПАРТКОМ ЯК СЛЕД РАЗГАРНУЎ РАБОТУ ПА ВЯРБОЎЦЫ. РАЙКОМ ЛКСМБ І РАЙКАЛГАССАЮЗ ДА ГЭТАГА ЧАСУ ДУМАЮЦЬ, ШТО ІХ НЕ ДАТЫЧЫЦЬ НАБОР ВЯРБОЧАЙ СІЛЫ ДЛЯ ДАНБАСУ.

КЛІЧАЎ. РАЙКАЛГАССАЮЗ ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЯ ВЫКАНАЎ ДЫРЭКТЫВУ — ВЫЛУЧЫЦЬ АДКАЗНАГА РАБОТНІКА ПА ВЯРБОЎЦЫ. УКАЗАНЬНІ КАЛГАСАМ АБ ВЯРБОЎЦЫ ГАРНЯКОЎ НЯ ДАНЫ. РАЙВЫКАНКАМ І ЎПАЎНАВАЖАНЫ ПК КП(б)БКОМ І ЎПАЎНАВАЖАНЫ ПК КП(б)БТАВ. ЧЭПЕЛЬСКІ БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЮЦЬ, ЗА ХОДАМ ВЯРБОЎКІ НЯ СОЧАЦЬ І ЗА ХОДАМ ВЯРБОЎКІ НЯ КІРУЮЦЬ. **ПА РАЕНЕ ЗАВЕРБАВАНА ТОЛЬКІ 27 ЧАЛ. ЗАМЕСТ 200 ПАВОДЛЕ КАНТРОЛЬНАЙ ЛІЧБЫ.**

***

ТАЛАЧЫН. У ТАЛАЧЫНСКІМ РАЕНЕ ЯШЧЭ НЯ ВЫЗНАЧАНЫ СЕЛЬСАВЕТЫ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ВЯРБОЎКІ. РАЙКАЛГАССАЮЗ АПАРТУНІСТЫЧНА ЗАЯЎЛІЎ, ШТО «ЛЮДЗЕЙ НЯМА». ЗГОДНА КАНТРОЛЬНАЙ ЛІЧБЫ РАЕН ПАВІНЕН ДАЦЬ ДАНБАСУ 200 БУДАЎНІЧЫХ РАБОЧЫХ. **НЕ ЗАВЕРБАВАНА НІ АДНАГО.** ТРЭБА ВЫЯВІЦЬ **КАНКРЭТНЫХ** ЗРЫВІШЧЫКАЎ ВЯРБОЎКІ.

***

ЧАВУСЫ. З БОКУ ЧАВУСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ НАГЛЯДАЕЦЦА ПОЎНАЯ ПАСЫЎНАСЬЦЬ У СПРАВЕ НАБОРУ РАБОЧЫХ ДЛЯ ДАНБАСУ. КАНТРОЛЬНАЯ ЛІЧБА Ў 150 РАБОЧЫХ **ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ.**

***

ШКЛОЎ. У ШКЛОЎСКІМ РАЕНЕ ВЕЛЬМІ ДРЭННА СТАІЦЬ СПРАВА З АДПРАЎКАЙ ЗАВЕРБАВАНЫХ РАБОЧЫХ У ДАНБАС. З ЗАВЕРБАВАНЫХ **149 ЧАЛАВЕК АДПРАЎЛЕНА ТОЛЬКІ 2.** ЗАДАНЬНЕ ПА ВЯРБОЎЦЫ АМАЛЬ ВЫКАНАНА (ПА РАСКЛАДЦЫ НІКІП РАЕН ПАВІНЕН ДАЦЬ 150 ЧАЛАВЕК І ПА РАСКЛАДЦЫ ЦК ЛКСМБ — 30 КАМСАМОЛЬЦАЎ). РАЙКОМ ЛКСМБ ВЫСУНУЎ СУСТРЭЧНЫ У 45 КАМСАМОЛЬЦАЎ ЗАМЕСТ 30. **10 ВЕРАСЬНЯ АДПРАЎЛЯЕЦЦА ПЕРШАЯ ПАРТЫЯ КАМСАМОЛЬЦАЎ.**

ЗУСІМ НЕДАПУШЧАЛЬНАЕ ЗЬЯВІЦЦА ТОЕ, ШТО **РАЕННАЯ ГАЗЭТА** НЕ АСЬВЯТЛЯЕ ХОДУ ВЯРБОЎКІ. АДДЗЕЛ КАДРАЎ ГОР. ШКЛОВА ВЯДОМЫ, ЯК ІДЗЕ ВЯРБОЎКА ПА РАЕНЕ. БЫЛІ ВЫПАДКІ, КАЛІ КАЛГАСЬНІКІ ПРЫХОДЗІЛІ Ў АДДЗЕЛ КАДРАЎ І ІХ СУСТРАКАЛІ ЗАМКНУТЫЯ ДЗЬВЕРЫ.

ПРЫЗЫЎ У РСЧА

ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ У ВАЙСКОВЫЯ ШКОЛЫ

Даць поўнацэннае папаўненьне АБВШ

Надыходзіць час, калі вайсковыя школы будуць папаўняцца новым складам мападых курсантаў. З 15 верасьня па 1 кастрычніка адбудзецца прыём у вайсковыя школы.

Задача ўкамплектаваньня вайсковых школ зьяўляецца баявой задачай у справе ўмацаваньня абароназдольнасьці Савецкага Саюзу.

Падрыхтоўка камандных кадраў для Чырвонай армії, якія былі-б на ўзроўні новых, сучасных патрабаваньняў баявой падрыхтоўкі, якія-б па сваім сацыяльным складзе адпавядалі клясавай прыродзе Чырвонай армії, як армії дыктатуры пралетарыяту,—усё гэта зьяўляецца рашаючым фактарам у справе ўзмацненьня баяздольнасьці Чырвонай армії.

Падбор кандыдатаў у вайсковыя школы зьяўляецца кроўнай справай рабочай клясы. Укамплектаваньне вайсковых школ новымі кандыдатамі ні ў якім разе ня можа праходзіць самацёкам. Партыйныя і камсамольскія арганізацыі, прафсаюзы, Асоавіяхім, кіруючыя дырэктывамі партыі і савецкай улады аб парадку камплектаваньня вайсковых школ, павінны прыняць самы актыўны ўдзел у вярбоўцы і падборы новых кандыдатаў для прыёму ў вайсковыя школы ў гэтым годзе.

Неабходна, каб паказаныя арганізацыі ў бліжэйшыя дні разгарнулі шырокую масавую растлумачальную работу вакол задач і парадку вярбоўкі ў вайсковыя школы.

На кожным прадпрыемстве, на заводзе, у кожным саўгасе і калгасе неабходна растлумачыць, што ў вайсковыя школы можа папасьці не абыхто, а тых, якія ўмеюць рыхтаваць чырвонаармейцаў і каподшы начскład і вайсковыя падразьдзелы да баявой дзейнасьці».

«Вайсковыя школы даюць камандзіраў, бязумоўна адданых пралетарскай дыктатуры, актыўных праваднікоў уплыву камуністычнай партыі ў армії, актыўных палітычных выхавальцаў чырвонаармейцаў, актыўных барацьбітоў за пяцігодку за чатыры гады, за суцэльную калектывізацыю і на базе яе за ліквідацыю кулацтва як клясы». (З усесарм. нарада сакратароў парт. ячэек).

Вайсковая справа і задачы баявой падрыхтоўкі з кожным днём усё больш і больш ускладняюцца. Рост ваеннай тэхнікі як у капіталістычных арміях, так і ў Чырвонай армії, патрабуе мець камандзіра з вялікім кругазорам у ваеннай справе, патрабуе ўдарных тэмпаў у рабоце вайсковых школ, а гэты ў сваю чаргу патрабуе высокага агульна-асьветнага ўзроўню ад паступаючых у вайсковыя школы. Да гэтай якасьці пры адборы кандыдатаў у вайсковыя школы трэба адносіцца з усёй сур'ёзнасьцю.

Ад курсанта вайсковай школы—будучага камандзіра—патрабуецца вялікая фізічная выносьлівасьць, добрае здароўе. Неабходна паляпшаць работнікаў органаў аховы здароўя, каб ня было з іх боку тэй няўважлівасьці пры адборы кандыдатаў у вайсковыя школы, якая дапускалася ў мінулым годзе.

Чырвонаармейцы ў пенкутну.

Некаторыя з нізавых прафсаюзных арганізацый, а таксама адміністрацыі заводу у справе вярбоўкі кандыдатаў у вайсковыя школы праўляні ў лепшым выпадку пасыўнасьць, а часамі зусім паранішкаджалі гэтай справе, выходзячы са сваіх вузка-цэхавых інтарэсаў, расцэньваючы справу выкананьня прамфінпляну вышэй за справу падрыхтоўкі вайсковых кадраў. Неабходна па лініі партыйнай і прафсаюзнай арганізацый разьбіць дашчэнту гэтыя шкодныя думкі.

Прафсаюзныя, партыйныя і камсамольскія арганізацыі, ячэйкі Асоавіяхіму, кіраўнікі заводаў, саўгасаў, калгасаў павінны правяць ініцыятыву і шырока разгарнуць масавую работу вакол справы вярбоўкі кандыдатаў у вайсковыя школы.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на вярбоўку кандыдатаў у Беларускую Аб'яднаную Вайсковую Школу імя ЦВК БССР, як школу, якая рыхтуе камандныя кадры для беларускіх нацыянальных вайсковых часьцей Чырвонай армії.

М. Я.

Як паступіць у АБВШ

У 1931 годзе прыём у Аб'яднаную Беларускую Вайсковую Школу імя ЦВК БССР будзе праводзіцца з 15 верасьня па 1 кастрычніка. У школе ёсьць два аддзяленьні—пяхотнае і артылерыйскае. Узрост паступаючага — ад 17 да 23 год. з асьветай ня ніжэй 4-х груп сямігодкі (асобы, якія скончылі сямігодкі, 9-годкі і ім адпаведныя навучальныя ўстановы, вызваляюцца ад іспытаў). Пры паступленьні ўсе кандыдаты будуць праходзіць мэдычны агляд, пасьля чаго будуць праходзіць мандатную і навучальную (экзаменацыйную) камісіі.

Усе грамадзяне, падаўшыя заявы паміма вярбовачных камісій, непасрэдна ў школу, павінны прыехаць у школу (гор. Менск, Камунальная вул., 29) за ўласныя грошы з 15 верасьня па 1 кастрычніка. У выпадку няпрыняцьця ў школу, праезд назад—таксама за ўласныя грошы.

Усім грамадзянам, што едуць для паступленьня ў школу як праз вярбовачныя камісіі, так і самастойна, належыць мець на руках наступныя дакументы: аўтабіяграфію (пажадана засьведчаную), якая павінна заключаць сацыяльнае паходжаньне, становішча бацькоў і паступаючага, прыналежнасьць да УсеКП(б), УсеЛКСМ; афіцыяльныя даныя аб узросьце; даведку мэдычнай камісіі аб стане здароўя; дакладныя засьведчаныя даведкі, дзе, калі і колькі працаваў і ў якасьці каго (даведку аб знаходжаньні ў прафсаюзе і з якога часу); аб нясудзімасьці; водзыў ад ячэйкі УсеКП(б) або УсеЛКСМ, прафсаюзу, сельсавету, райвыканкому; даведку мясцовай улады аб непазбаўленьні выбарчых правоў бацькоў і таго, хто паступае; тым, што паступаюць бяз іспытаў, неабходна мець дакумэнт аб асьвеце.

Пры адсутнасьці хаця-б аднаго з паказаных дакумэнтаў кандыдаты прыняцьця ўсіх дакумэнтаў. Каб да атрыманьня ўсіх дакумэнтаў, аКБ уніхнуць траты лішніх сродкаў і часу на праезд, прапануецца сваячасова загатовіць усе вышэйпаказаныя дакумэнты.

Заявы асоб, якія ня зьявяцца на іспыты да паказанага тэрміну, разглядацца ня будуць.

Для тых, што прыяжджаюць на прыём, будзе дана харчаваньне за ўласныя грошы.

Больш падрабязныя даведкі аб вайсковых школах можна атрымаць у раённых або ў гарадзкіх вярбовачных камісіях.

Начальнік і камісар школы
ВАСІЛЕВІЧ.
Ч. в. а. ад'ютанта
РАМАНОЎСКІ.

У Менску вярбоўка не разгорнута

15 верасьня пачынаецца прыём у АБВШ. Але менская вярбовачная камісія яшчэ не разгарнула работу. З вызначанай кантрольнай лічбы Менск ня выканаў і 5 проц. Вярбовачная камісія апошні раз выбіралася ў чэрвені месяцы.

Неабходна ў дні, што засталіся, ажыцьвіць работу менскай вярбовачнай камісіі і ліквідаваць прарыў. Час ня чакае.

Школа павінна сваячасова атрымаць кандыдатаў.

М. Я.

ДВУХДЭКАДНІК РАДЫЁ

РАДЫЁ— НА СЛУЖБУ ПЯЦІГОДЦЫ

Радыё — адна з самых балвых, адна з самых дзейсных зброй культурнай рэвалюцыі. Радыё дзень за днём ахапляе ўсё новыя і новыя пласты перадавікоў сацыялістычнага будаўніцтва — ударнікаў і калгасьнікаў.

Шпаркімі крокамі наперад пачынае ісьці савецкая радыё-тэхніка, перамагаючы бюракратычны кансэрватызм і апартуністычнае супраціўленьне.

Радыё з яго шматмільённай аўдыторыяй радыё-слухачоў можа і павінна зрабіцца моцнай зброяй партыі і савецкай улады ў барацьбе за будаўніцтва сацыялізму, за мабілізацыю шырокіх мас працоўных на выкананьне плянаў сацыялістычнай будоўлі.

У наяўнасьці рэзкае адставаньне ўсёй радыё-справы ад плянаў і тэмпаў сацыялістычнай рэканструкцыі.

Пляны радыё-будаўніцтва і радыёфікацыі сыстэматычна ня выконваюцца. Радыёпрамысловасьць разгорнута невыстарчальна, радыёустаноўкі, што маўчаць, — масавае зьявішча, якое зводзіць на нішто радыё-вяшчальную работу.

Радыёвяшчаньне хварэе на рад цяжкіх хваробаў, якія перашкаджаюць ператварэньню яго ў сапраўдную, дзейсную зброю бальшавіцкага наступленьня.

Радыёгазэты ў значнай ступені малодзейсныя, неапэрацыйныя, часта палітычна бясхрэбетныя. Яны ня маюць шырокай базы для свайго разьвіцьця—разгорнутага рабселькораўскага руху, адарваны ад друкаваных газэт.

У радзе радыёгазэт былі выкрыты апартуністычныя памылкі і скажэньні.

У мастацкім радыёвяшчаньні ёсьць рычалкі ня толькі кізкай якасьці, халтурнасьці перадач, але і праяўленьні рэакцыйнай лініі і практыкі ў пытаньнях мастацтва.

Навукова-асьветнае вяшчаньне яшчэ ня стала зброяй марксыцка-ленінскага выхаваньня мас, зброяй аўладаньня тэхнічнымі ведамі.

Задача шырокай савецкай грамадзкасьці — выкрыць усе памылкі і недахопы, разгарнуўшы стаўчую работу ў дапамогу радыё-справе.

Двухдэкадник агляду і дапамогі радыё, які пачынаецца па ініцыятыве «Крестьянской газеты» 11 верасьня, праводзіцца пры непасрэдным удзеле органаў друку, радыё-арганізацый і кіраўніцтва УсеСПС, ЦК камсамолу, ТПР, ЦУР, Асоавіяхіму і раду іншых грамадзкіх арганізацый.

Праверыць і ўздарэвіць усю справу радыёфікацыі, радыёбудаўніцтва і радыёвяшчаньня, даць разгорнутую бальшавіцкую крытыку стану радыёсправы ў Саюзе і на аснове яе выпачаць шляхі далейшага разьвіцьця радыё ў СССР, садзейнічаць уздыму і ўмацаваньню радыёкораўскага руху, дапамагчы арганізацыі пізавога вяшчаньня да трансляцыйнага вузла на заводзе, фабрыцы, у калгасе, саўгасе — такія асноўныя заданьні агляду.

Радыёагляд павінен ператварыцца ў масавую палітычную кампанію за вывучэньне тэхнікі радыё шырокімі масамі рабочых і калгасьнікаў, за рэканструкцыю радыёвяшчаньня, максымальнае пашырэньне працуючых радыёпунктаў і ператварэньне радыё ў магутны сродак у барацьбе за перабудову прафработы.

Штаб агляду зварачаецца да ўсіх рабочых і калгасьнікаў Савецкага Саюзу:

Уключайцеся ў агляд.

Пішэце ў газэту, як працуе ваша ўстаноўка, ваш вузел, якая якасьць мясцовага і цэнтральнага вяшчаньня, якія недахопы трэба зьнішчыць, якія паляпшэньні вы можаце прапанаваць.

Партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі!

Скліканьце канфэрэнцыі радыёслухачоў, разгорнуйце канкрэтную крытыку радыё-гаспаладаркі і радыёвяшчаньня.

Разгортвайце сваё вяшчаньне па правадох і вузлох заводаў, саўгасаў, калгасаў, фабрычных пасёлкаў.

Стварайце штабы агляду і брыгады садзейнасьці пры рэдакцыях краёвых, раённых, заводзкіх і калгасна - саўгасных газэт.

Арганізуйце справаздачы радыёвузлоў і радыёцэнтраў.

Выносьце на абгаварэньне шырокіх сходаў рабочых і калгасьнікаў пляны разьвіцьця радыёгаспадаркі і рэканструкцыі радыёвяшчаньня.

Садзейнічайце ўмацаваньню і перабудове работы вчэек ТПР на фабрыках, заводах, у калгасах і саўгасах.

Па-бальшавіцку перабудуем радыёвяшчаньне і рушым наперад савецкую радыёгаспадарку.

Штаб агляду.

Пад кантроль са вецкай грамадзкасьці

Апошнія гады ўнесьлі значны перапом у савец

ПАВЯРНУЦЬ СПАЖЫВЕЦКУЮ КААПЭРАЦЫЮ тварам да вядучых галін сельскай гаспадаркі

Жывёлагадоўля ў БССР—вядучая галіна сельскай гаспадаркі. Ні следствы [illegible] тэрміна свайго існавання, [illegible] жывёлагадоўля дабіўся значных [illegible] тэхнікі. У стадах саўгасаў і калгасаў [illegible] тавараных фарм налічвалася соцні [illegible] штук жывёлы. Па БССР [illegible] сотага і 79 сыгнагадоўчых саўгасаў, у якіх знаходзіцца звыш 20.000 [illegible]матак. Таварнасьць жывёлагадоўлі [illegible] тавараных фарм і саўгасаў складае [illegible] 65 проц. На 1 жніўня сацыялістычныя фабрыкі малака і мяса прадаюць [illegible] 253.100 цэнт. малака.

Перад усімі арганізацыямі і ў прыватнасьці перад спажывецкаапэрацыяй Беларусі, якая вырашаецца адным з важнейшых жывёлагадоўчых раёнаў і [illegible] сыгнагадоўчым цэхам Савецкага Саюзу, паўстаў і ўрадам пастаўлена цэнтральная задача—падрыхтаваць самую работу рэалізацыі дыктатуры аб разгорнутым сацыялістычным жывёлагадоўлі. У пастановах па гэтым пытанні есьць цэлая сыстэма [illegible] мерапрыемстваў, ажыцьцяўленьне якіх адарвае самыя шырокія перспэктывы спэцыялізацыі сельскагаспадарчай Беларусі ў жывёлагадоўчым напрамку.

Пасьле кантрольных лічбаў ЦК ВКП(б) і СНКВ ужо ў гэтым годзе стаўка будзе жывёлам павінна быць дададзена да 1.042.000 штук, сьвіней—на 9.710 тысяч штук. На 1932 г. дадзена больш расгорнуты план.

Адтак, весткі з раду жывёлагадоўчых раёнаў — Любаньскага, Слуцкага, Уваровіцкага, Рагачоўскага—са шматлікіх саўгасаў і калгасаў сыгналізуюць аб тым, што спажывецкая каапэрацыя гэтых раёнаў не павярнулася тварам да жывёлагадоўлі і ігнорыруе дырэктывы партыі і ўраду аб паляпшэньні забесьпячэньня і грамадзкага харчаваньня. Многія райсаюзы, сельспажытаварыствы і жывёлагадоўчыя раёны не перабудзілі сваёй работы. У забесьпячэньні жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў прамтаварамі і некаторымі прадуктамі—адзіна прарывы. Грамадзкае харчаваньне на полях і ў саўгасах пастаўлена дрэнна. Сетка новых сталовак не разгорнута. У сэнсу недасканалай работы каапэрацыі ў радзе саўгасаў Беларустросту была сарвана праполачная кампанія.

Тавары пасустрач уборачнай кампаніі—такая дырэктыва была дана ўсім [illegible] спажывецкай каапэрацыі. Як-жа яна рэалізавала? Для жывёлагадоўчых-малочных і сьвінагадоўчых саўгасаў Беларустросту і Сьвінавода былі вызначаны далажэньні прамтаварамі і прадуктамі фонды для прэміраваньня рабочых, калгаспікаў у часе уборачнай кампаніі на суму 250.000 руб. Гэтыя фонды фактычна засталіся на паперы, бо большасьць саўгасаў прамтаварамі не атрыманы.

Вось весткі з некаторых саўгасаў. Саўгас «Вымна» да ўборачнай кампаніі [illegible] быў атрымаць ад Суражскага райспажытаварыства 93 кг. цукру, 48 кг. рыбы і 300 грам чаю (!). Не атрымана ніводнага [illegible] і носкат: гэтыя 300 грам чаю ці [illegible] каапэрацыі не адмыслілі. Саўгасу Цішінчы каапэрацыі вылучана фонд для прэміраваньня ўборачнай на 1.000 руб. Наряды атрымані, тавару няма. Саўгасы Сьвінавода атрымалі на больш 10 проц. цукру, [illegible] пашыю.

Ніякіх спажыўкаапэрацыяй і Сьвінаводам заключэн гэнэральны дагавор аб арганізацыі грамадзкага харчаваньня ў саўгасах. Але Белкаапсаюз ужо [illegible] ў гэты дагавор, пасьпешае якой сталоўні могуць быць адкрыты толькі ў тых саўгасах, дзе налічваецца ня менш 100 рабочых. Сьвінавод не згадзіцца. Пакуль ідуць спрэчкі, ніводная сталоўня ніяк не адкрываецца.

Некаторыя райсаюзы і сельспажытаварыствы жывёлагадоўчых раёнаў [illegible] быць рашуча задаволены. Асобныя сігналы фактычна мелі месца ў рабоце крыўніцтва Любаньскага райсаюзу, які адачыніў патураў кулацкім гаспадаркам. У выніку безгаспадарчасьці і нерасправядчасьці дэфіцыт райсаюзу дасягнуў 34.000 руб. Райсаюз патураў кулацкім элементам і не прымушаў іх выконваць цьвёрдыя заданьні на здачы малака.

Чаго варта работа другога райсаюзу—Рагачоўскага,—калі перавод на гаспадарны разрахунак зроблен толькі фармальна, зьдзельнічыне сярод работнікаў прымаўку на ўведзена, абязьлічка не ажыцьцяўлена. Райсаюз праваліў мабілізацыю сродкаў.

Не адстае і Слуцкі райсаюз, які перавяў на гаспадарчы разрахунак толькі краму.

Крыўніцтва раёнаў саўгасу імя Сталіна таксама паказвае прыклад, як ня трэба арганізаваць. У саўгасе гніюць фрукты, прамадзець адкіды сталовак, а каапэратары ня прымаюць мер для арганізацыі сушкі і адкормачнага пункту.

Вясьпрэчна, што значная доля віны за дрэнную работу раду каапэрацыйных арганізацыяў у жывёлагадоўчых раёнах ляжыць на партыйных і прафесіянальных арганізацыях, якія не мі часта стаяць у баку ад ня перабудоўтага часу на вачох у кіруючых органаў райсаюзам кіраваў п'ятіка Войтаў, які скажаў прынцыпы рабочага забесьпячэньня, займаўся самазабесьпячэньнем і г. д.

На гэтым фоне бязьдзейнасьці, самацёку, ігнараваньня штодзённых патрэбаў рабочых саўгасаў і калгасьнікаў заслугоўвае ўвагі ініцыятыва ўдарнікаў сьвінагадоўчага саўгасу «Анопаль», Койданаўскага раёну, якія па-бальшавіцку узяліся за перабудову каапэрацыі і рэалізацыю пастановы ЦК УсесКП(б) аб паляпшэньні грамадзкага харчаваньня.

Работа ў сталоўцы саўгасу «Анопаль» пастаўлена так, што яна поўнасьцю спрыяе правільнай арганізацыі працы ў саўгасе, барацьбе з цякучасьцю рабочых і выкананьню прамфінплану. Сталоўка зьяўляецца сапраўдным цэхам саўгасу і заслугоўвае назвы паказальнай, узорнай сталоўкі ня толькі сярод саўгасаў Койданаўскага раёну, але і сярод саўгасаў усёй Савецкай Беларусі.

У сталоўцы заўсёды чысто. Каб забесьпечыць яе тлушчамі і мясам, арганізавана сьвінадкормачны пункт, арганізуецца малочная ферма. Харчы гатуюцца добраякасна. Адмоўстайнасьці ў гатаваньні страў няма. Каб не адрываць рабочых ад работ, харчы возяцца на поле ў тэрмасах. Добра наладжан улік выдаткаваньня прадуктаў. Грамадзкім харчаваньнем ахоплены ўсе рабочыя сэзонныя, нежанатыя і часка сямейных. У выніку такой пастаноўкі работы сталоўка замест ранейшай страты пачала даваць прыбытак.

У сваім адкрытым лісьце праз газэту «Сельска-гаспадарчы рабочы» рабочыя саўгасу «Анопаль» зьвярнуліся да ўсіх ударнікаў, рабочых і работніц саўгасаў БССР з заклікам арганізаваць «мітынг сталовак» для абмену досьвітам работы па грамадзкім харчаваньні і конкурсе на лепшую сталоўку.

Анопальцы заклікаюць усіх рабочых саўгасаў безадкладна ўключыцца ў спрэчку практычнай рэалізацыі пастановы ЦК УсесКП(б) аб паляпшэньні грамадзкага харчаваньня, арганізаваць сталоўку ў кожным саўгасе, палепшыць санітарнае становішча, ліквідаваць урэшнілаўку і абязьлічку ў рабоце сталовак і г. д.

Гэта ініцыятыва рабочых саўгасу «Анопаль» на адным з важнейшых участкаў работы спажывецкай каапэрацыі павінна быць падхоплена ўсімі саўгасамі. Трэба выкарыстаць вопыт перадавых прадпрыемстваў БССР—Гомсельмашу, заводу імя Варашылава, імя Пэнцуцкага,—якія распачалі масавы паход за каапэрацыйны мінімум. Гэтыя прадпрыемствы вылучылі ў апарат спажывецкай каапэрацыі дзесяткі сацыялістычных намесьнікаў, рабочыя калектывы аказваюць каапэрацыі практычную дапамогу ў ня штодзённай рабоце.

Жывёлагадоўлі, як вядучай галіне сельскай гаспадаркі БССР—пераважнае забесьпячэньне. Спажывецкая каапэрацыя ў жывёлагадоўчых раёнах павінна самым рашучым чынам перабудаваць сваю работу, выходзячы з задач разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі, выкарчаваць са сваёй практыкі рэшткі апартунізму і пэтманоўскіх тэндэнцый і сапраўды павярнуцца тварам да сацыялістычных фабрык малака і мяса. Белкаапсаюз павінен аказаць у гэтым практычную дапамогу мясцовым арганізацыям. Трэба прапрадаваць пытаньне аб мэтазгоднасьці, стварэньня аўтаномнай сэкцыі па абслугоўваньні жывёлагадоўчых саўгасаў.

Міх. Кін.

Да адказу

УВАРАВІЧЫ. Уваравіцкі райсаюз на выходзіць з паласы прарываў. На чале праўленьня доўгі час стаяў апартуніст і п'яніца ВОЙТАЎ, які акружыў сябе кампаніяй з некаторых раённых работнікаў і больш займаўся самазабесьпячэньнем і п'янствам, чым перабудовай каапэрацыі. Былое апартуністычнае кіраўніцтва райкому партыі нічога не рабіла, каб адарваць работу каапэрацыі.

Па раёне ёсьць 21 сельскае спажыўтаварыства, але імі ніхто ня кіруе, работа іх не прааналізуецца. Адсюль частыя растраты і злоўжываньні. Сельспажыўтаварыства працуе з дэфіцытам.

Работа ва ўсёй сыстэме Ўуравіцкай спажыўкаапэрацыі праводзіцца па-старому, гаспадарчага разрахунку няма. Фінансавае становішча пагражаючае. Штаты райсаюзу і сельспажыўтаварыстваў раздуты.

Фонды каапэраваньня бедняты ня выкарыстаны. Апарат каапэрацыі засьмечан былым гандлярскім і кулацкім элементам, які падрывае работу каапэрацыі.

Прадукты і прамтавары, якія вызначаліся для саўгасаў і калгасаў, часта вывозіліся на іншыя патрэбы. Райсаюз ня спрэвіўся з работай па ўцягненьні новых пайшчыкаў. У трэцім квартале замест 4870 пайшчыкаў уцягнута 137. У раёне 75.000 чалавек насельніцтва, а пайшчыкаў усяго 15.000. План паянкапленьня за трэці квартал выкананы усяго на 12,2 проц., па ўкладах і авансах—на 47,9 проц. і па будаўніцтве—на 20 процантаў.

Новае кіраўніцтва Ўуравіцкага райкому КП(б)Б сур'ёзна заняліся паляпшэньнем работы каапэрацыі і прыняло рад мер. Трэба ўсіх тых, хто перашкаджае ці не жадае дапамагчы перабудове каапэрацыі, выкінуць з каапэрацыйнага апарату. Уваравіцкі раён павінен мець добрую каапэрацыю.

А. КАЗІМІРАЎ.

Замест жывога апэрацыйнага кіраўніцтва—самацёк і абязьлічка

СЛУЦАК. Слуцкія раённыя каапэрацыйныя арганізацыі ігнаруюць дырэктыву партыі і ўраду аб перабудове. Пералому ў рабоце каапэрацыі няма. У забесьпячэньні рабочых МТС, сельскагаспадарчых майстэрань, аўтобуду — перабоі. Прарывы ў грамадзкім харчаваньні не ліквідаваны. У сталоўках — бруд, чарга. Райсаюз дапамог саўгасам адкрыць сталоўкі, але ён зусім ня цікавіцца, як яны працуюць.

Райсаюз зусім не аддае ўвагі якасным паказьнікам работы прадпрыемстваў. Хлеб, які выпякаецца ў пякарні «Рабочы каапэратар, надзвычай нізкай якасьці. Ёсьць выпадкі, калі хлеб прадаецца зусім сырым.

Абязьлічка не ліквідавана. З усіх крам і прадпрыемстваў на гаспадарчы разрахунак пераведзена толькі адно прадпрыемства, дый тое часткова.

Замест жывога апэрацыйнага кіраўніцтва кізэвымі зьвяньнямі райсаюз займаецца рассылкай цыркуляраў.

Усё гэта ставіць пад пагрозу выкананьне дырэктыў партыі аб паляпшэньні абслугоўваньня і асабліва капектываў жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасьнікаў.

Адпаведныя кіруючыя арганізацыі павінны заняцца ўзмацненьнем работы Спускай каапэрацыі.

Я. ЖЫЛКА.

Рагачоўскія каапэратары тармозяць тавараабарот

РАГАЧОЎ. Перабудова спажывецкай каапэрацыі Рагачоўскага раёну тварам да сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі праходзіць чарапашымі тэмпамі. Перавод крам на гаспадарчы разрахунак зроблен толькі фармальна, зьдзельнічына ня ўведзена, абязьлічка ня зьнішчана. Справай спэцыялізацыі магазынаў і крам у мэтах лепшага абслугоўваньня спажыўца і паскарэньня тавараабароту ніхто не займаецца. Наадварот, ёсьць і дагатуль выпадкі затаварваньня. У райсаюзе капіцца 3 год ляжаць тавары на 13.000 руб., а на асобных крамах гарадзкога спажыўтаварыства — да 2.500 руб. Па некаторых сельспажыўтаварыствах, як ДВАРЭЦКАЕ, АСАЎНІЦКАЕ, КРУШЫНАЎСКАЕ, КУРГАНСКАЕ, рэалізацыя такіх тавараў, як абутак, хусткі і г. д., зацягваецца ад 3 да 5 месяцаў.

У выніку апартуністычнага самацёку ў мабілізацыі сродкаў план па паянкапленьні выкананы на 48 проц., па ўзносах на будаўніцтва — на 67 проц.

Сталоўкі працуюць вельмі дрэнна, у падобных прадпрыемствах становішча ня лепшае.

Апарат райсаюзу засьмечан лішэнцамі, былымі гандлярамі і г. д. Парт'ячэйка і масцком праўленьня райсаюзу і гарСТ не рэагуюць на гэта агіднае зьявішча.

Л. С.

МАШЫНЫ—УБОРАЧНАЙ

ДАБІЦЬ АБЯЗЬЛІЧКУ НА ГОМСЕЛЬМАШЫ

ВУЧЭЦЕСЯ У ЗБОРШЧЫКАЎ СІЛАСАРЭЗАК ЗМАГАЦЦА ЗА ТЭМПЫ

ВЫПУСК СІЛАСАРЭЗАК (дзённае заданьне—37)

4 верасьня	5 верасьня	6 верасьня
37	37	37

ГОМСЕЛЬМАШ. (БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ»).

ЖНІВЕНЬСКУЮ ВЫТВОРЧУЮ ПРАГРАМУ ГОМСЕЛЬМАШ ВЫКАНАЎ НА 80 ПРОЦ. ЗА МЕСЯЦ ЗАВОД ВЫПУСЬЦІЎ 844 СІЛАСАРЭЗКІ—93,8 ПРОЦ. ПЛЯНУ, 196 СЯЧКАРАНЬ—49 ПРОЦАНТАЎ ПЛЯНУ, 207 БУЛЬБАМЫЕК І 206 БУЛЬБАСАРТОВАК. ПАРАЎНАЛЬНА З ЛІПЕНЕМ ВЫПУСК ПРАДУКЦЫІ НА ГОМСЕЛЬМАШЫ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ Ў РАЗЬМЕРЫ 25,8 ПРОЦ. ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ ВЫРАСЛА НА 11 ПРОЦ.

У МЭТАХ БЕСЬПЕРАБОЙНАЙ ПАДАЧЫ ДЭТАЛЯЎ ЗАГАТОЎЧЫМ ЦЭХАМ, ЗБОРАЧНЫЯ ЦЭХІ ПЕРАЙШЛІ НА 6-ДНЕЎКУ. ГЭТА МЕРАПРЫЕМСТВА СПРЫЯЛА БОЛЬШ ВЫРАЗНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РАБОТ.

ПАЧЫНАЮЧЫ З ПЕРШЫХ ДЗЁН ВЕРАСЬНЯ, ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ, ВІДАВОЧНА, УЗЬНІМАЕЦЦА ЎВЕРХ. ПА АСОБНЫХ МАШЫНАХ ВЫТВОРЧАЯ ПРАГРАМА ВЫКОНВАЕЦЦА НА ЎСЕ 100 ПРОЦ., ЗАДАНЬНЕ ПА ВЫПУСКУ БУЛЬБАМЫЕК І БУЛЬБАСАРТОВАК ПЕРАВЫКОНВАЕЦЦА.

МЭХАНІЧНЫ ЦЭХ—АДЗІН З АСНОЎНЫХ ВІНАВАТЫХ У НЕВЫКАНАНЬНІ ПРАГРАМЫ ПА СЯЧКАРНЯХ. І ДА ГЭТАГА ЧАСУ МЭХАНІЧНЫ ЦЭХ НЯ ЗДОЛЕЎ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ДЭТАЛЯМІ ЗБОРКУ СЯЧКАРАНЬ. АДНАК, І НА САМОЙ ЗБОРЦЫ СЯЧКАРАНЬ ЁСЬЦЬ ШМАТ СУР'ЁЗНЫХ ВЫТВОРЧЫХ НЕПАЛАДАК, ЯКІЯ ЗРЫВАЮЦЬ ВЫКАНАНЬНЕ ПРАГРАМЫ. У ЦЭХУ ЯШЧЭ ЗАХАВАЛІСЯ АБЯЗЬЛІЧКА І ЎРАЎНІЛАЎКА. НА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК ЦЭХ ПЕРАЙШОЎ ТОЛЬКІ ФАРМАЛЬНА, НА ПАПЕРЫ, ПРАВІЛЬНАЙ РАССТАНОЎКІ СІЛ НЯМА.

**

КАМСАМОЛЬЦЫ ЗБОРАЧНАГА ЦЭХУ Ў ПАДАРУНАК XVII МЮД'У ВЫПУСЬЦІЛІ 5 СІЛАСАРЭЗАК І 6 СЯЧКАРАНЬ, ЗРОБЛЕНЫХ У НЕРАБОЧЫ ЧАС.

А. Купрыянчык, А. Сячко.

РЭАЛІЗУЕМ АДОЗВУ ЦК І СНК АБ ЖЫВЁЛАГАГОЎЛІ

НЕ АДЗІН, А ДЗЕСЯЦЬ СЬВІНАРНІКАЎ БУДАВАЦЬ ШТОДЗЕННА

Да 15-га лістапада—ні аднаго незакончанага сьвінарніка і скотнага двара!

Апошнія дзьве дэкады жніўня далі ВЕЛЬМІ НЯЗНАЧНЫ ЗРУХ у будаўніцтве сьвінарнікаў па саўгасах Сьвінаводу.

З пачатых будаўніцтвам 564 сьвінарнікаў на 1 верасьня БЫЛІ СКОНЧАНЫ ТОЛЬКІ 102. За два тыдні па ўсіх саўгасах скончылі пабудову ТОЛЬКІ 17 СЬВІНАРНІКАЎ. 462 сьвінарнікі яшчэ знаходзяцца ў працэсе будоўлі, прычым 355 сьвінарнікаў ужо закончаны звыш чым на 50 проц.

Ня гледзячы на катэгарычную дырэктыву аб тым, каб да сканчэньня пачатага будаўніцтва не пачынаць новага,—за апошнія два тыдні пачалі будаваць яшчэ 54 новыя сьвінарнікі, чым яшчэ больш павялічылі недахват рабочай сілы і будаўнічых матар'ялаў.

Колькасьць рабочых, занятых па пабудовах, на 1 верасьня дасягае толькі 8.800 у той час, калі патрэбна 7.700 чалавек. За два тыдні колькасьць рабочых на пабудовах павялічылася толькі на 525 рабочых.

Падвозка лесаматар'ялаў да пабудоў ідзе вельмі марудным тэмпам. Калі на 1 жніўня круглага лесу было падвезена 57 проц. патрэбнай колькасьці, дык на 1 верасьня мы маем усяго 62 проц. Піламатар'ялаў на 1 жніўня было 32 проц., а на 1 верасьня—34 проц., цьвікоў на 1 жніўня — 23 проц., на 1 верасьня — вось-жа самая колькасьць. Дахавага матар'ялу на 1 жніўня—30 проц., на 1 верасьня — 32 проц.

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што як саўгасы, так і будаўнічыя вучасткі за два тыдні АМАЛЬ НІЧОГА НЕ ЗРАБІЛІ, каб падвесьці да пабудоў круглы лесаматар'ял, каб арганізаваць расьпілоўку матар'ялаў у саўгасах, поўнасьцю нагрузіўшы цыркуляркі і гантарэзкі, якія там ёсьць.

У радзе месц, з прычыны недахвату матар'ялаў, будаўніцтва або спынілася, або рабочыя нагружаны толькі на 50%.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове, апублікаванай 2 верасьня, канстатаваў, што будаўніцтва скотных двароў, цялятнікаў і сьвінарнікаў знаходзіцца пад яўнай пагрозай зрыву. ЦК ускладаў на дырэктараў саўгасаў адказнасьць за ход будаўніцтва нароўні з начальнікамі вучасткаў. Гэта павінны памятаць ДЫРЭКТАРЫ САЎГАСАЎ.

Неабходна зараз-жа максымальна разгарнуць ПАДВОЗКУ круглага лесаматар'ялу да пабудоў і арганізаваць РАСЬПІЛОЎКУ матар'ялаў тут-жа ў саўгасах.

Ніякіх спасыланьняў на адсутнасьць гонтаў і цьвікоў ПАРТЫЯ НЕ ПАЦЕРПІЦЬ. Трэба як можна шырэй скарыстаць мясцовыя будаўнічыя матар'ялы — ГЛІНУ І САЛОМУ. Выведзеныя пад дах сьвінарнікі павінны быць НАКРЫТЫ НЕ ПАЗЬНЕЙ ЧЫМ ПРАЗ 10 ДЗЁН. Там, дзе няма гонты і цьвікоў, трэба зараз-жа НАКРЫВАЦЬ СЬВІНАРНІКІ САЛОМАЙ.

У сваёй пастанове ЦК КП(б)Б прапанаваў на працягу двух дзён перакінуць на пабудовы Белсельбуду 18 тэхнікаў і 5 інжынэраў з другараднага будаўніцтва. Гэта мерапрыемства, якое павінна ўзмацніць тэхнічнае кіраўніцтва Белсельбуду, Наркамправы не праведзена.

9 верасьня толькі праз 7 дзён пасьля абвяшчэньня пастановы, Наркамправы, нарэшце, вылучыў брыгаду, якой даручана высьвятліць, з якіх аб'ектаў і ўсіланой можна перакінуць патрэбных тэхнікаў і інжынэраў.

Ня выканан і другі пункт гэтай пастановы, які прапануе Наркамснабу і Белкаапсаюзу тэрмінова арганізаваць бесьперабойнае забесьпячэньне рабочых, занятых на будаўніцтве ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасных таварных фэрмах. Ніякага паляпшэньня ў харчаваньні рабочых пакуль што няма. У сталоўках, дзе харчуюцца рабочыя-будаўнікі, як і раней, бруд, антысанітарыя, дрэнная і несваячасовае забесьпячэньне.

З 15 жніўня па 1 верасьня на пабудовы прышло 800 новых рабочых. Але за гэты-ж час пакінула работу звыш 400 чалавек. Такая цякучасьць рабочай сілы зьяўляецца выключна вынікам дрэннай, нікуды ня вартай работы сталовак і перабояў у забесьпячэньні рабочых прамтаварамі і прадуктамі харчаваньня.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове адзначае, што «будаўніцтва ў жывёлагадоўчых калгасах і саўгасах зьяўляецца важнейшай гаспадарча-палітычнай задачай для ўсіх партыйных арганізацый».

І сапраўды, да сканчэньня будаўнічага сэзону засталося яніх-небудзь два месяцы, але тэмпы будаўніцтва, якія мы маем на сёнешні дзень, пагражаюць зрывам выкананьня важнейшай задачы — паставіць у пяцілетцы на наступленьня хападоў сьвіное стада саўгасаў.

Наркамправы, Наркамснаб, Белкаапсаюз і Лесбел павінны, нарэшце, выкананць дырэктыву партыі, стварыўшы адпаведныя ўмовы для максымальнага фарсаваньня будаўніцтва ў жывёлагадоўчых калгасах і саўгасах.

Раённыя партыйныя арганізацыі, дырэктары саўгасаў і начальнікі будаўнічых вучасткаў павінны зараз максымальна скарыстаць наяўную рабочую сілу і мясцовыя будаўнічыя матар'ялы.

НЯ 17 СЬВІНАРНІКАЎ ЗА ДВА ТЫДНІ, А 10 СЬВІНАРНІКАЎ ШТОДЗЕННА ПАВІННЫ ЗАКАНЧВАЦЦА ПАБУДОВАЙ У САЎГАСАХ СЬВІНАВОДА.

Толькі пры такіх тэмпах мы сапраўды выканаем дырэктыву партыі.

А. Б.

„Ня наша гэта справа"

У сьвінасаўгасе ЗАМОШША плян будаўніцтва па ўсіх першачарговых аб'ектах выкананы ўсяго на 14 проц. Пакуль што пачата будаўніцтва толькі аднаго сьвінарніка з пяці. Саўгас стаіць перад пагрозай недабудовы 500 сьвінамесц.

У гэты-ж час група кваліфікаваных будаўнікоў саўгасу скарыстоўваецца не на будаўніцтве сьвінарніка, а на будаўніцтве жыльлёвага дому. Якасьць і плянаваньне будаўніцтва з боку мэханізацыі і выгад абслугоўваньня вельмі незадавальняючыя (кухня далёка ад сьвінарнікаў, направільны сток вады).

Ня гледзячы на гэта, дырэкцыя саўгасу, партыйныя, камсамольскія арганізацыі не зацікаўлены ў наборы рабочай сілы і лепшай арганізацыі саміх работ для пасьпяховага сканчэньня будаўніцтва. Дырэкцыя займаецца толькі папярэдзіць сыгналізацыяй у Белсельбуд, аусім не мабілізуючы сіл на будаўніцтва. «Ня наша гэта справа—вінаваты у зрыве будаўніцтва Белсельбуд»—заўляе дырэктар саўгасу тав. Шаўченка.

Аб культурна-масавай і палітычнай рабоце сярод будаўнікоў забыліся ўсе—і рабфком, і партыйныя, і камсамольскія ячэйкі. «Цяжка весьці работу, жывуць яны ў розных вёсках»,—заўляе старшыня рабфкому тав. Сасноўская.

САРАЕЎ.



Новы сьвінарнік у калуне «Праца».

Цесьляры працуюць чорнарабочымі

ВУЗДА. (Нап. кар.). Саўгас «КУХЦІЧЫ» ў канцы году будзе мець звыш 350 сьвінаматак і ў два разы больш сьвіней па адкорм. Каб забясьпечыць месцам гэтае стада, трэба паводле плану да 1-га верасьня скончыць пабудову некалькіх сьвінарнікаў, ізалятара і сьвіной кухні. Апрача таго павінен быць пабудаван двухпавярховы дом для рабочых.

Як-жа ідзе будаўніцтва ў саўгасе? Сьвінарнікі пабудавалі толькі да страхі і спынілі з-за адсутнасьці матар'ялу для страх і цьвікоў. Да будаўніцтва сьвіной кухні і дому яшчэ нават не прыступілі. Ізалятар будуецца такімі тэмпамі, якія не гарантуюць сканчэньня яго да зімы. Брыгада цесьляроў не нагружана і часта скарыстоўваецца ў якасьці чорнарабочых.

Дагэтуль няма расцэнак на паасобныя віды работ. Кожны раз пры пераходзе з аднаго аб'екту будаўніцтва на другі паміж адміністрацыяй і цесьлярамі пачынаюцца спрэчкі. Пакуль яны прыходзяць да згоды, праходзіць некалькі дзён.

Белсельбуд і дырэкцыя саўгасу павінны зараз-жа стварыць умовы для пасьпяховага разгортваньня будаўніцтва саўгасе «Кухцічы» і сканчэньня яго ў тэрмін.

Шустры.

„НІ аднаго цэнтнэра збожжа прыватніку"

ХАОС І БЛЫТАНІНА

ў справаздачнасьці Саюзхлеба і Белкаапсаюзу зрываюць плянавае кіраўніцтва збожжазагатоўкамі

Яшчэ ў мінулым годзе ў часе заготовак збожжа і ільну «Зьвязда» сыгналізавала аб грэбным становішчы з [illegible] і справаздачнасьцю на загатоўках. «Зьвязда» адзначала, што пастаноўка ўліку не дае магчымасьці кіраўнікам загатоўкамі, скацэнтраваць сілы на найбольш аголеных і слабых участках загатоўчага фронту, дазарыентуе рэгулюючыя арганізацыі.

Пямылкі мінулых год ня ўлічаны і ня выпраўлены. Вопыт збожжазагатовак г.г. досыць красамоўна гаворыць аб тым, што становішча з уліком паступленьня збожжа ня толькі не палепшылася, але значна пагоршылася. Уліч загатовак—у самым агідным становішчы. У заводках панае поўная блытаніна і непарадак. Адны лічбы супярэчаць другім, адны даныя абвяргаюць другія. Безадказная пастаноўка ўліку ўводзіць у зман рэгулюючыя органы, дазарыентуе савецкую грамадзкасьць. Агіднае становішча справаздачнасьці не дае Наркамснабу магчымасьці плянава кіраваць збожжазагатоўкамі, выпраўляць дапушчаныя памылкі, падцягваць адсталыя участкі.

Можна прывесьці дзесяткі фактаў аб злачынай блытаніне ва ўліку.

Даныя Саюзхлеба зусім разыходзяцца з лічбамі Белкаапсаюзу. Адны і тыя-ж раёны фігуруюць—у заводках Белкаапсаюзу, як перадавыя, а ў даных Саюзхлеба, як адсталыя. Крупкі, паводле даных Саюзхлеба павінны быць занесены на чорную дошку за зрыў збожжазагатовак, а Белкаапсаюз прапануе рэдакцыю занесьці Крупкі на ганаровую дошку, як адзін з перадавых раёнаў. Такая-ж гісторыя з Гомелем, Горкамі, Полацкам, Шкловам і г. д.

Паводле даных адной з апошніх зводак Саюзхлеба, БССР выканала 7,8 проц. гадавога плану, праз дзень-два становішча зьмяняецца—на сьвет зьяўляецца новая лічба—«6,2 проц.»; праз некалькі дзён пасьля праверкі зьяўляецца, што і лічба 6,2 проц. узята са столі і не адпавядае сапраўднасьці. Белкаапсаюз складае агульныя зводкі на аснове далёка няпоўных даных—з гасы раёну здалі 25 проц. жнівеньскага пляну адпаасобнікі—6,2 проц. у

Партыйныя ячэйкі на мясцох не праводзілі сходаў бедняты. Высковы актыў не прыцягнут да кампаніі. У некаторых вёсках (Ліпскі, Блюдніцкі сельсаветы) падрыхтоўка праведзена «кавалерыйскім наскокам».

Сельсаветы не даюць ніякіх вестак аб тым, як здаюць збожжа кулацка-заможныя гаспадаркі.

Пленум райкому, які пядаўна адбыўся, пастанавіў мабілізаваць на месяц адказных работнікаў для пасылкі на вёску ў мэтах ліквідацыі прарыву ў загатоўках. Праз месяц адбудзецца кантрольны пленум, які праверыць выкананьне заданьня.

А. Казіміраў.

Наркамснаб за ўвесь час ня прыняў ніякіх мер, каб наладзіць улік.

Апарат Наркамснабу прымаў на веру хлусьлівыя даныя, кіраваўся імі, будаваў на аснове іх свае планы.

Толькі зараз Наркамснаб перадаў пра куратуры справу аб прыцягненьні Белкаапсаюзу да адказнасьці.

Белкаапсаюз і Белхлебжыўцэнтр нічога не зрабілі, каб наладзіць выразную работу вучотна-статыстычнага апарату на мясцох, і дутымі лічбамі зводзілі ў зман рэгулюючыя арганізацыі.

Статыстычны апарат Саюзхлеба сваімі памылкамі, дубляванымі лічбамі яшчэ больш пагоршываў становішча.

Так далей быць ня можа! Нельга кіраваць загатоўкамі бяз выразна наладжанага ўліку.

Мы патрабуем ад Наркамснабу неадкладна ўпаладкаваньня справаздачнасьці і прыняцьця рашучых мер.

Мы лічым, што НК РСІ павінен неадкладна ўмяшацца ў гэту справу.

Чырвоныя абозы імя МЮД'у

ВІЦЕБСК, 7. У ДЗЕНЬ МЮД'У Ў ВІЦЕБСК ПРЫБЫЛІ ШМАТЛІКІЯ ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ. НА ПРАЦЯГУ ЦЭЛАГА ДНЯ СКЛАДЫ САЮЗХЛЕБА БЕСЬПЕРАБОЙНА ПРЫМАЛІ ПРЫВЕЗЕНУЮ ПРАДУКЦЫЮ. КАМСАМОЛЬСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ КАЛГАСАЎ І ВЁСАК ВІЦЕБСКАГА РАЁНУ АРГАНІЗАВАЛІ ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ З 850 ФУРМАНАК.

УСЯГО ЗДАНА 84 ТОНЫ ЗБОЖЖА РОЗНЫХ КУЛЬТУР.

БЯЗ ПЛЯНАЎ І ПАДРЫХТОЎКІ

УВАРАВІЧЫ. (Нап. кар.). Збожжазагатоўкі па раёне праходзяць нездавальняюча. Гэта тлумачыцца дрэннай падрыхтоўкай і позьнім складаньнем плянаў. Толькі 21 жніўня пляны былі даведзены да сельсаветаў. Гэта выклікала продаж збожжа на прыватным рынку. Калі пляну адпаасобнікі—6,2 проц. у

Партыйныя ячэйкі на мясцох не праводзілі сходаў бедняты. Высковы актыў не прыцягнут да кампаніі. У некаторых вёсках (Ліпскі, Блюдніцкі сельсаветы) падрыхтоўка праведзена «кавалерыйскім наскокам».

Сельсаветы не даюць ніякіх вестак аб тым, як здаюць збожжа кулацка-заможныя гаспадаркі.

Пленум райкому, які пядаўна адбыўся, пастанавіў мабілізаваць на месяц адказных работнікаў для пасылкі на вёску ў мэтах ліквідацыі прарыву ў загатоўках. Праз месяц адбудзецца кантрольны пленум, які праверыць выкананьне заданьня.

А. Казіміраў.

Дрыбынскія каапэратары

зрываюць грамадзкае харчаваньне рабочых будаўнікоў

Будаўнічы вучастак № 14 Белсельбуду ў саўгасе ДРЫБІН будуе сьвінарнік. Пабудова павінна быць скончана ва ўдарным парадку таму, што сьвіньні стаяць пад адкрытым небам.

Гэтага не разумеюць дрыбінскія каапэратары.

На пабудове працуе 35-40 чал. штодзённа. Дрыбінскае сельпо райсаюз адмаўляюцца забясьпечыць гэтых рабочых прадуктамі па адпаведных нормах.

Неабходна прыняць самыя рашучыя меры, каб будаўніцтва скончыць своечасова. РСІ павінна прыцягнуць да адказнасьці тых каапэратараў, якія зрываюць грамадзкае харчаваньне і гарпозяць будаўніцтва.

А. КРЫМСКІ.

Напішам „гісторыю фабрык і заводаў БССР"

Аляксей Максімавіч Горкі выступіў у «ПРАВДЗЕ» (7 верасьня № 217) з новай прапановай вялізарнейшага рэвалюцыйна-палітычнага і культурнага значэньня: ён прапануе па прыкладзе «гісторыі грамадзянскай вайны» стварыць «гісторыю фабрык і заводаў» Савецкага Саюзу.

Гэтай прапановай Аляксей Максімавіч яшчэ раз паказаў, якім пястомным, гарачым энтузіястам сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляецца наш вялікі пралетарскі мастак і ўдарнік у складзе першай ударнай брыгады сусьветнага пралетарыяту.

«ГІСТОРЫЯ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ», паводле думкі Аляксея Максімавіча, павінна

Пад ударамі рэвалюцыйнай хвалі хістаецца будынак крывавай дыктатуры

Год выдання—XV
№ 247 (4152)
Пятніца 17 верасьня 1931
Цана нумару 5 кап.
БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Ваенна-палявыя суды—крок наперад у падрыхтоўцы інтэрвэнцыі

1-га верасьня за подпісам прэзыдэнта польскай рэспублікі агалошана распараджэньне рады міністраў аб увядзеньні ва ўсёй Польшчы ваенна - палявых судоў. Фактычна-ж, як нават прызнае і польская буржуазная прэса, акт гэты азначае ўвядзеньне ва ўсёй краіне стану аблогі.

Пракуратура на аснове першапачатковых «дазнаньняў» польскай паліцыі, характар і мэтады допыту якія вядомы ўсяму сьвету, абавязана на працягу 2-х дзён скласьці акт абвінавачаньня і ўручыць яго падсудным.

Усе злачынствы, якія звычайным судом караліся катаржнымі работамі, ваенна - палявымі судамі будуць карацца сьмерцю. Злачынствы, якія караліся направым домам або звычайнай турмой, зараз палявым судом будуць карацца ад 10 да 15 год катаргі. Ведаючы добра крывадушнасьць польскіх судзьдзяў і «допыты» дэфэнзывы, можна сьмела сказаць, што нават самыя нязначныя палітычныя злачынствы будуць карацца сьмерцю, а ў лепшым выпадку — 15 гадамі катаргі. Прысуд перагляду не падлягае.

Характэрна, што ўся польская буржуазная прэса—ад урадавай да сацыял-фашысцкай — зьмясьціла аб гэтым толькі кароценькія інфармацыйныя паведамленьні. Больш таго, фашысцкая і сацыял - фашысцкая прэса ўжыла ўсе мэры да таго, каб затушаваць гэты факт перад шырокімі працоўнымі масамі. Сацыял - фашысцкая прэса ўзяла на сябе ролю давесьці шырокім галодным масам, што гэты дэкрэт накіраваны на супроць іх, а супроць бандытаў і розных крыміналіста́ў, якія грабяць чужую маемасьць, парушаюць права грамадзкай і асабістай бясьпечнасьці, і толькі мімаходам успамінае аб падпадальні пад ваенна-палявыя суды і злачынства за «парушэньне грамадзкага спакою», за ўдзел у дэманстрацыі галодных мас. Польскія сацыял-фашысты, уся «апазыцыйнасьць» якіх да ўраду Пілсудзкага зводзіцца да намыльваньня вяроўкі на шыбеніцах для будучых ахвяр, у сваім органе «Роботнік» у досыць шырокіх артыкулах падаюць усе параграфы б. царскага карнага кодэксу, па якіх будуць дзейнічаць палявыя суды. Але фашысцкая і сацыял-фашысцкая прэса толькі мімаходам успамінае аб «здрадзе гэтынай», яна не называе артыкулаў з карнага кодэксу гэтага «злачынства». Прэса замоўчвае той факт, што ўжо зараз гэтае «злачынства» ў беларускай Польшчы 10.000 палітзьняволеных пакутуюць у турэмных казэматах, дзе над імі фашысцкія каты праводзяць крывавую расправу. Фашысцкая і сацыял - фашысцкая прэса замоўчвае, што іменна па абвінавачаньні ў «здрадзе гэтынай» польская паліцэйшчына праводзіла і зараз праводзіць крывавую «пацыфікацыю» на Зах. Украіне і Зах. Беларусі.

Стан аблогі ў буржуазных краінах звычайна ўводзіцца ў часе вайны. З кімжа ваюе фашысцкая Польшча?

Увядзеньне стану аблогі сьведчыць аб слабасьці фашысцкай дыктатуры, як прызнае нават сацыял - афіцыйныя «Роботнік», — аб хваробе ўсёй сыстэмы, аб банкруцтве фашысцкай дыктатуры. З другога боку, увядзеньне стану аблогі сьведчыць аб гіганцкім росьце рэвалюцыйнага руху як у самой Польшчы, так і рэвалюцыйна - вызваленчага руху на акупаваных Зах. Украіне і Зах. Беларусі. Гаспадарчы разавал фашысцкай Польшчы пагыбляецца не па днёх, а па гадзінах. Яркую характарыстыку гаспадарчага становішча Польшчы дае «Газэта Варшаўска» ў перадавым артыкуле ў № 276. Палемізуючы з урадавым блёкам, эндэцкі орган піранічна зазначае на

«правал тэорыі сучаснага прэм'ера міністраў, а раней міністра фінансаў Прыстара аб дно крызісу. Паводле гэтай тэорыі» вынікала, што ўжо тады (у часе ўхваленьня бюджэту) Польшча знаходзілася на самым «дне крызісу», а тэму яна ня можа гаспадарча ўпасьці ніжэй, і наадварот, будзе паступова, але сыстэматычна гаспадарча падымацца. З прамовы Прыстара тады вынікала, што горш ужо быць ня можа, а будзе што раз лепш, што ўрад прыме рашучыя меры барацьбы для ўстамаўленьня роўнавагі бюджэту і барацьбы супроць беспрацоўя. Але як адно, так і другое ад вясны значна пагоршыліся. А значыць — дно крызісу ня было дном, а калі можа і было дном, дык дном рухомым. Ад вясны апусьціліся мы ўніз разам з тым дном, і невядома, як доўга будзем яшчэ зьяжджаць уніз».

Такія піранічныя заўвагі адносна гаспадарчага становішча Польшчы робіць, як бачым, нават сама фашысцкая прэса.

Бюлетэнь-жа варшаўскага кан'юнктурнага інстытуту піша:

«Пры сучасным псыхічным стане насельніцтва і пры схільнасьці да панікі ня толькі ня можа быць гутаркі аб паляпшэньні становішча ў бліжэйшыя месяцы, але наадварот, трэба лічыцца з магчымасьцю яшчэ большага пагоршаньня фінансавага становішча і скарачэньня вытворчасьці».

Гэта азначае, што ня толькі шырокія масы, але нават дробная буржуазія ня верыць у магчымасьць калі-небудзь выйсьці з крызісу звычайным шляхам, без патрасеньняў.

На глебе ўсё ўзрастаючага гаспадарчага развалу проста жахлівым, катастрафічным зьяўляецца становішча рабочай клясы. Кожны дзень адбываюцца закрыцьці ўсё новых фабрык і заводаў. Шматтысячная армія беспрацоўных расьце бязупынна. Выступленьні беспрацоўных, а таксама і працуючых рабочых становяцца ўсё больш частымі і масавымі. Гэтыя выступленьні, асабліва беспрацоўных, адначаюцца сваёю ўпартасьцю і зацятасьцю. Даволі бывае іншы раз якой-небудзь дробязі, каб яна выклікала вялізарны выбух шэву і абурэньня працоўных мас, выклікала ўпартую зацятую барацьбу супроць эксплёататараў, супроць фашысцкай дыктатуры. Яркім прыкладам гэтага служыць Горадня, Беластох, Вільня, забастоўка трамвайшчыкаў у Варшаве і інш.

Ад пралетарыяту не адстае і працоўнае сялянства Польшчы, асабліва на так званых «крэсах усходніх». Агнём і мячом распраўляўся польскі фашызм увосень мінулага году над працоўнымі масамі Зах. Украіны. Крывавая расправа, карныя экспэдыцыі ні на хвіліну на спыняліся да гэтага часу, яны адбываюцца і зараз, аб чым сьведчаць нават буржуазныя англійскія журналісты, якіх цельга западозрыць у асаблівых сымпатыях да украінскіх працоўных мас. Ня гледзячы на крывавую расправу разьюшаных фашыстаў, рэвалюцыйныя выступленьні супроць акупантаў у Зах. Украіне ня спыняюцца.

Калі ў мінулым годзе фашызм дзіка распраўляўся над працоўнымі Зах. Украіны, працоўныя масы Польшчы і Зах. Беларусі слаба на гэта рэагавалі, ня было масавых выступленьняў у абарону іх. У гэтым годзе і на гэтых вучастках рэвалюцыйнага фронту адставаньне выраўнана, рэвалюцыйны рух значна ўзмацніўся. Зараз па ўсёй Зах. Беларусі адбываюцца буйныя выступленьні сялянства супроць падаткаў, супроць парваркаў, супроць фашысцкай дыктатуры, прычым выступленьні гэтыя адбываюцца не ў паасобных вёсках і нават не ў валасьцях, а ў цэлых акругах. Сялянства, даведзенае грабежніцкай палітыкай акупантаў да роспачы, стыхійна падымаецца, пускае «чырвонага пеўня» ў панскія двары, сядзібы асадпікаў і кулакоў, у палёнізатарскія школы, ва ўрадавыя будынкі і дзяржаўныя лясы. Маса сялянства ў прыгранічных паветах ня бачачы іншага выхаду ў даны момант, кінулася напралом над градам куль у СССР, дзе працоўныя масы пад кіраўніцтвам партыі Леніна нябывалымі ў гісторыі тэмпамі будуюць сацыялізм.

Рэвалюцыйны фронт выраўноўваецца, адстаючыя вучасткі падцягваюцца. Гаспадарчы-ж развал у фашысцкай Польшчы бязупынна, з кожным днём пагыбляецца. Становішча працоўных мас з кожным днём пагоршваецца. Прыклад СССР, дзе ліквідавана беспрацоўе, дзе працоўныя масы над кіраўніцтвам камуністычнай партыі дасягнулі вялізарных посьпехаў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, паказвае ім, што толькі пралетарская рэвалюцыя вызваліць іх ад барбарскай эксплёватацыі, ад беспрацоўя, руіны, голаду і галечы.

Фашысцкая Польшча на вулкане. Фашызм адчувае, як высьлізгае глеба з-пад яго ног, як хістаецца ўвесь будынак крывавай дыктатуры. Фашызм хапаецца за надзвычайныя меры — уводзіць ваенна-палявыя суды. Ня прыходзіцца гаварыць, што яны накіраваны выключна супроць рэвалюцыйнага руху, магутный хвалі якога бушуюць усё больш грозна, супроць гераічнай камуністычнай партыі. Ведаючы добра практыку фашысцкага правасудзьдзя, над ваенна - палявы суд лёгка будзе падведзена любое злачынства рабочага — беспрацоўнага або селяніна. Больш таго, досыць будзе донасу якога-небудзь сышчыка або паліцэйскага, каб на падставе ваенна-палявога суда павіс на шыбеніцы кожны «непажаданы» рабочы або селянін. Крывая фашысцкая дыктатура гэтымі надзвычайнымі мерамі думае ратавацъ сябе. Сталыпінскай сыстэмай, масавым расстрэлам рэвалюцыйных рабочых і сялян фашызм думае спыніць магутны поступ пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы.

Пралетарыят СССР і ўсяго сьвету павінен магутнай сьцяной выступіць у абарону сваіх братоў на клясе — польскіх пралетараў і іх авангарду кампартыі. Ваенна - палявыя суды — гэта ачышчэньне тылоў ад рэвалюцыйных элементаў, гэта крок наперад у падрыхтоўцы інтэрвэнцыі супроць СССР.

Пралетарыят БССР на ўвядзеньне стану аблогі ў фашысцкай Польшчы адкажа ўзмацненым тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, каб тым самым наблізіць сусьветны Кастрычнік.

Армія беспрацоўных расьце

НЯМЕЧЧЫНА

БЭРЛІН. Па афіцыяльных даных колькасьць зарэгістраваных на біржы працы беспрацоўных у Нямеччыне раўнялася на 1-га верасьня 4.195.000 чал. Дапамогі па страхаваньні па беспрацоўі атрымалі па 1-га верасьня ўсяго 2.377.000 беспрацоўных, рашта 1.819.000 атрымалі дапамогу з дабрачынных муніцыпальных кас ці зусім не атрымалі дапамогі.

АНГЛІЯ

ЛЁНДАН. На 31-га жніўня афіцыяльна зарэгістравана беспрацоўных у Англіі лічыцца 2.752.219, г. зн. на 28.437 больш, чым у мінулым тыдні і на 761.775 больш, чым на тое-ж чысло мінулага году (ТАСС).

СТАЛЫПІНСКІМІ МЕРАМІ НЕ СПЫНІЦЬ МАГУТНАГА ПОСТУПУ ПРАЛЕТАРСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

Працоўныя ўсяго сьвету, згуртаванымі рада мі выступайце ў абарону сваіх братоў па клясе—польскіх пралетараў

ПРАТЭСТ МІЛЬЁНАЎ

Да рабочых і працоўнага сялянства фашысцкай Польшчы

АДКРЫТЫ ЛІСТ 2.000 РАБОЧЫХ ГОМЕЛЬСКАГА ДЭПО

Таварышы!

Капіталістычны сьвет бяспынна пяліць у бяздоньне. Ратуючы сябе перад пралетарскай рэвалюцыяй, якая шпармі крокамі набліжаецца, ён зьверскі расправяляецца з рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі. Капіталізм будуе новыя турмы-гіганты. Асабліва потуе белы тэрор. У БЕЛАПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ, дзе палітзьняволеных зрэўнаны ў правах з крымінальнымі злачынцамі, з прафесыянальнымі бандытамі і злодзеямі. Дафэнзыва ператварыла штодзённа крывавыя расправы над рабочымі і працоўным сялянствам як у засьценках турмаў, так і на «волі». КАРНЫЯ ЭКСПЭДЫЦЫІ ЗАЛІВАЮЦЬ ПАЛІ ЗАХ. БЕЛАРУСІ І ЗАХ. УКРАІНЫ.

Таварышы! Барбарскай расправай над папоньнікамі капіталу ў турмах і над рэвалюцыйнымі працоўнымі масамі на свабодзе польскі фашызм рыхтуе сабе тыл, каб пачаць крывавы паход на Савецкі Саюз — бацькаўшчыну пралетарыяту ўсяго сьвету. Імпэрыялістычныя драпежнікі ўсяго сьвету, у тым ліку і фашысцкая Польшча, хочуць пераступаюць у рады МОПР'у і адлічаюць адназённы заработак у карысьць палітзьняволеных і іх сем'яў.

Сьмерць фашысцкім катам! Няхай жыве камуністычная партыя Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны!

Няхай жыве Кастрычнік ва ўсім сьвеце!

* * *

Агульны сход служачых Бабруйскага паштоўчага дому ў адказ на белы тэрор разьюшанага польскага фашызму сабраў на радзімным лісьце ў карысьць МОПР'у 200 рублёў, што складае 100 проц. адназённага заработку.

Калектыў выклікае калектывы міліцыі і ДПУ пасьледаваць яго прыкладу.

* * *

ЖЛОБІН. Агульны сход жонак рабочых ст. Жлобін на разьюшаны тэрор польскіх фашыстаў у турмах адказвае:

«Мы ведаем, што фашысцкія наймыты хочуць фізычна зьнішчыць рэвалюцыйных барацьбітоў. 10.000 палітзьняволеных знаходзяцца ў засьценках фашысцкіх турмаў, ім пагражае сьмерць ад тых, каго пралетарыят вымеў жалезнай мятлой з краіны Саветаў.

Няхай ведаюць фашысцкія каты, што ніякім тэрорам ім не задушыць рэвалюцыйны рух працоўных мас Польшчы!

Сход жонак рабочых адпадушна ўхваліў адпрацаваць адзін дзень на падтрыманьне палітзьняволеных і іх сем'яў. Апрача гэтага жанчыны праводзяць збор сродкаў сярод рабочых і служачых.

— Мы заклікаем працоўных жанчын усяго сьвету, — гаворыцца ў рэзалюцыі пратэсту, — узьняць голас рашучага пратэсту супроць фізычнага зьнішчэньня лепшых змагароў за рабочую справу.

Калгасьнікі калгасаў «Герой рэвалюцыі», «Чырвоны муравей» і «Чырвоны бераг» супольна з аднасобнікамі вёскі Казлоў Бераг рашуча пратэстуюць супроць сярэднявяковых катаваньняў палітзьняволеных у турмах белапанскай Польшчы. Калгасьнікі шлюць сваё брацкае прывітаньне барацьбітом рэвалюцыі.

Калгасьнікі ў адказ на тэрор пастанавілі ўнесьці па 50 кап. кожны і абвясьцілі сябе ўдарнымі па датэрміновым выкананьні асеньняй сяўбы і засеве аднаго гектара ў кожным калгасе ў фонд абароны краіны.

— Мы, рабочыя арцелі фурманоў гор. Мсьціслаўля, поўнасьцю далучаемся да рэзалюцыі пратэсту арцелі «Серп і молат», якая выклікала на сацыяборніцтва, і ўносім 86 руб. на дапамогу папоньнікам фашызму і іх сем'ям.

* * *

— Мы чуем стогны рэвалюцыйных барацьбітоў ў казэматах фашысцкай Польшчы, як-бы глыбока фашысцкія каты іх ня ўтойлівалі. Рукі прэч ад барацьбітоў за справу пралетарскай рэвалюцыі! — заяўляюць у рэзалюцыі пратэсту супрацоўнікі спуцкага леспрамгасу.

У адказ на тэрор супрацоўнікі леспрамгасу і прадпрыемстваў адлічаюць адназённы заработак — 200 руб. У фонд дапамогі палітзьняволеным і іх сем'ям.

6.454 рублі на дапамогу палітзьняволеным

ВОРША. (наш. кар.). Наступленьне Польшчы фашызму на правы палітзьняволеных польскіх турмаў барбарскія катаваньні і вьдзекі над імі выклікалі моднае абурэньне рабочых, служачых і працоўных Аршанчыны. Хваля пратэстаў супроць белага тэрору ня спыняецца ўвесь час. На мітынгах пратэсту савецкая грамадзкасьць Аршанчыны шляхам адлічэньняў ад пэнсіі і па падпісных лістох сабрала і перадала ЦК МОПР'у БССР 6.454 руб.

Збор пралетарскай дапамогі працягваецца.

* * *

Воднікі Бабруйску выказваюць сваё абурэньне з прычыны нячуваных вьдзекаў польскага фашызму над тысячамі лепшых барацьбітоў за рабочую справу.

У адказ на белы тэрор воднікі ўсе

Чаму навучыліся кітайскія салдаты ў савецкім палоне

ТОКІЁ. Цзяньці-зінская кітайская газэта «Дагун-бао» зьмяшчае артыкул аб росьце камуністычнага руху ў Паўночным Кітаі, угрунтаваную на даносьнях жандарскага кіраўніцтва ў Бэйпіне.

Артыкул аддае асабліва многа ўвагі росту камуністычнага ўплыву ў вайсковых часьцях.

У радзе часьцей арганізаваны камуністычныя ячэйкі, якія дзейнічаюць з вялікім посьпехам.

Значны ўплыў зрабілі таксама салдаты, якія былі ў палоне ў СССР у часе савецка-кітайскага канфлікту. Многія камуністычныя ячэйкі ў вайсковых часьцях арганізаваны іменна гэтымі салдатамі. Яны пасылалі таксама сваіх прадстаўнікоў у Шансі. Апошняе паўстаньне ў Фуціне (Шансі), дзе быў створан савецкі ўрад і сфармован корпус Чырвонай арміі, а таксама паўстаньне ў мукдэнскіх часьцях, расквараваных каля Бэйпіну, **зьяўляюцца простым вынікам дзейнасьці былых палонькікаў.**

У часе арышту ў некаторых салдат знойдзены нумары нелегальнай камуністычнай часопісі «Прыяцель салдата», якая мае вялікае папырэньне ў войсках.

Камуністычны ўплыў таксама рэзка ўзмацніўся сярод рабочых Бэйпін-Мукдэнскай чыгункі. Мукдэнскі камітэт Гаміндану, з прычыны гэтага парашыў арганізаваць свой жоўты прафсаюз чыгуначнікаў.

У віры крывадушнасьці і здрадніцтва

БРЫСТОЛЬ. 7 верасьня ў Брыстолі (Англія) адкрыўся чарговы зьезд ангельскіх прафсаюзаў.

Уступная прамова старшыні аб'яднаньня прафсаюзаў Хэйдэя і даклад Сітрына аб палітыцы генэральнай (цэнтральнай) рады прафсаюзаў ірка адюстроўваюць узрастаючы неспакой сацыял-фашысцкай верхавіны прафсаюзаў перад ростам баявых настрояў шырокіх мас пралетарыяту. Падладжваючыся да настрояў рабочых мас, Сітрын наўмысьля рэзка крытыкаваў палітыку тых сацыял-фашысцкіх правадыроў, якія ўступілі ў тых званы «нацыянальны» ўрад (Макдональда, Сноўдэна і Томаса).

Як вядома, гэты ўрад складзен з прадстаўнікоў усіх трох партый ангельскай буржуазіі (кансэрватараў, лібералаў і сацыял-фашысцкай «рабочай» партыі). Супрацоўніцтва правадыроў «рабочай» партыі з цьвёрдалобымі і іх уступленьне ў «нацыянальны» ўрад, які адкрыта ставіць сабе задачай барацьбу з эканамічным крызісам за кошт жорсткага абграбленьня працоўных мас, выклікала абурэньне сярод рабочых. Улічваючы гэта, абурэньне і стараючыся ўтаіць **сапраўднае падтрыманьне Макдональда, Томаса і Сноўдэна сацыял-фашысцкай верхавінай прафсаюзаў,** Сітрын заявіў, што генэральная рада прафсаюзаў нібы «ня можа падпісацца» пад палітычнай праграмай Макдональда і Сноўдэна.

Працягваючы сваю наскрозь крывадушную прамову, Сітрын, хоць і вельмі асьцярожна, выказаўся за захаваньне дапамог для беспрацоўных. Цікава, што Хэйдэй, які выступаў перад Сітрыным, адкрыта прыпнаў, што дапамогі беспрацоўным неабходны таму, што «яны (дапамогі) адрацуюць нажыву (г. зн. буржуазію) ад становішча яшчэ больш катастрафічнага, чым сучаснае (г. зн. ад рэвалюцыі)».

100-тысячная дэманстрацыя перад ангельскім парлямантам

ЛЁНДАН, 9. Учора ноччу на пляцы перад будынкам парляманту сабралася больш 100 тыс. рабочых са сьцягамі. З прычыны баявога настрою рабочых улада прымушана была дазволіць дэпутацыі ўвайсьці ў парлямант. У чаканьні звароту делегацыі рабочыя з вялікім узбуджэньнем запоўнілі прылягаючыя да пляцу вуліцы, поўнасьцю спыніўшы рух. Да позьняй ночы дэманстрацыя не разыходзілася. Каля 11 гадз., калі частка рабочых ужо разышлася, на НАТОЎП БЫЛІ НАКІРАВАНЫ 10 ПАЛІЦЭЙСКІХ АЎТАМАБІЛЯЎ І КОННАЯ ПАЛІЦЫЯ, ЯКАЯ ПАЧАЛА ПАЛКАМІ ЗЬБІВАЦЬ РАБОЧЫХ. Сярод рабочых налічваецца шмат параненых. З ЧАЛ. БЫЛІ АДПРАЎЛЕНЫ Ў БОЛЬНІЦУ І КАЛЯ 70 ЧАЛАВЕК АРЫШТАВАНА (ТАСС).

Сусьветны крызіс паглыбляецца

ДАЛЕЙШЫ ГАСПАДАРЧЫ РАЗВАЛ У ПАЗШ

Амэрыканскія эканамічныя часопісі падатульваючы вынікі першага паўгоддзя 1931 году па розных галінах народнай гаспадаркі, прыходзяць да высноваў, што працягваецца рух уніз па ўсіх паказальніках.

Аналізуючы рэзультаты дзейнасьці чыгунак, «Фінансыяль Кронікль» падае наступныя даныя:

За першае паўгоддзьдзе 1931 г. натружана 19 млн. вагонаў супроць 23,2 млн. у 1930 г. і 25,6 млн. у 1929 г. Яшчэ большае зьніжэньне даюць лічбы тонакіляметраў. Тут зьніжэньне параўнальна з 1929 годам адбылося на 27 проц. Валавы даход усіх чыгунак зьнізіўся ў 1930 г. параўнальна з 1929 г. на 325 мільёнаў даляраў, а ў 1931 г. параўнальна з 1930 г. — на 504 млн. даляраў. Што-ж датычыць чыстага даходу, то ён зьнізіўся амаль напалову — з 818 млн. даляраў у 1929 г. да 471 млн. у 1931 г. Скарачэньне аб'ёму работ чыгунак журнал тлумачыць вялізарным паданьнем у першую чаргу аўтамабільнай прамысловасьці. За першае паўгоддзьдзе 1931 г. выпушчана 1.569 тыс. аўтамабіляў параўнальна з 2.199 тыс. у 1930 і з 3.225 тыс. у 1929 г.

Само на сабе гэтага было-б даволі,— піша журнал, — каб выклікаць дэпрэсію ў Амэрыцы нават, калі-б ня было сусьветнага крызісу або дэпрэсіі ў іншых галінах эканомікі. Але другія галіны прамысловасьці даюць ня менш рэзкае зьніжэньне.

Амэрыканскі інстытут жалеза і сталі паведамляе, што выплаўка чыгуна за першае паўгоддзьдзе 1931 г. зьнізілася да 11,2 млн. тон параўнальна з 18 млн. тон у 1930 г. і 21,4 тон у 1929 г. Па сталі адпаведныя лічбы даюць: 15,2 млн. тон у 1931 г., 23,6 млн. тон у 1930 г. і 29 млн. тон у 1929 г.

Аднак, самае вялікае зьніжэньне дае будаўнічая прамысловасьць, зьвязаная з усімі галінамі народнай гаспадаркі. За першае паўгоддзьдзе 1931 г. па 37 штатах, якія знаходзяцца на Ўсход ад Скалістых гор (г. зн. найбольш індустрыялізаваных штатаў) дазволаў на пабудовы ў суме 1.808 млн. даляраў параўнальна з 2.638 млн. даляраў у 1930 г. і 3.068 млн. даляраў у 1929 г.

«Фінансыяль Кронікль» і «Аналіст» указваюць, што надыходзячая восень ня прынесла з сабой звычайнага сэзоннага ажыўленьня. Аднак, далейшае паглыбленьне крызісу ў Эўропе яшчэ не адбілася на Амэрыцы. Таму трэба чакаць, што зімою 1931 г. усе эканамічныя паказальнікі дадуць яшчэ больш рэзкі скачок уніз.

ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА ЧЫРВОНАГА ПРАЛЕТАРСКАГА ФРОНТУ

БЭРЛІН, 9. Дыскусыйны сход, арганізаваны нямецкай кампартыяй у Бэрліне, на які быў запрошан старшыня бэрлінскай арганізацыі сацыял-дэмакратычнай партыі Кюнстлер, прайшоў з вялікім посьпехам.

Ужо за некалькі гадзін да пачатку сходу ўсе ближэйшыя вуліцы былі запружаны рабочымі, якія жадалі папасьці на гэты сход. Увесь раён быў акружан вялікімі атрадамі паліцыі. Калі бяз чвэрці шэсьць былі адчынены дзьверы залі, паліцыя ўжо праз некалькі хвілін зачыніла іх, з прычыны перапаўненьня. Дакладчыкам на сходзе выступіў член ЦК нямецкай кампартыі тав. Гэйнц Нэйман. Яго прамова ня раз перапынялася бурнымі авацыямі.

У спрэчках выступілі тры сацыял-дэмакратычныя рабочыя. На сход зьявіліся, ня гледзячы на забарону сацыял-дэмакратычнага кіраўніцтва, сотні сацыял-дэмакратычных рабочых. У выступленьнях сацыял-дэмакратычных рабочых было яркае відаць расчараваньне палітыкай сацыял-дэмакратычнай партыі і дакер'е кампартыі. 150 рабочых заявілі тут-жа на сходзе аб сваім уступленьні ў кампартыю. (ТАСС).

ЗАМЕСТ ПАСЫЛАК З-ЗАГРАНІЦЫ—ТАВАРЫ З МАГАЗЫНАЎ „ТОРГСІНУ"

У Менск прыехаў загадчык арэнднага аддзелу Ўсесаюзнага аб'яднаньня на гандлі з чужаземцамі («Торгсіна») тав. Хэйфэц.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам тав. Хэйфэц паведаміў наступнае:

У бліжэйшыя два тыдні арганізуецца беларускае аддзяленьне «Торгсіна» з магазынам і бюзай у Менску. Такія-ж магазыны будуць адкрыты і ў некаторых іншых гарадох БССР.

Усесаюзнае аб'яднаньне «Торгсін» мае ў сваім распараджэньні вялікія фонды прадуктовых і прамысловых тавараў шырокага спажываньня. Аб'яднаньне прыступае да разгортваньня новага віду апэрацыі — пасылачных. Замест пасылак, або разам з пасылкамі з-заграніцы на імя грамадзян, што пражываюць у БССР могуць быць зроблены праз заграніцныя банкі грашовыя валютныя пераводы на бягучы рахунак беларускага аддзяленьня «Торгсіну», які выдае на суму пераводу паказаныя ў заказе тавары са сваіх фондаў. У намэнклятуру тавараў «Торгсіна» ўключаюцца таксама і некаторыя імпартныя заграніцныя тавары.

Адпраўнік пераводу можа ў заказе не пералічваць намэнклятуры тавараў, прадаставіўшы выбар асобе, якой адасаваны тавар. Пераводы могуць быць зроблены з усіх краін сьвету і атрымальнікамі тавараў могуць быць усе грамадзяне, без выключэньня. Сума пераводу таксама не абмяжоўваецца.

У радзе гарадоў СССР — Маскве, Ленінградзе, Харкаве, Кіеве, Адэсе, Ростове-на-Доне, Тыфлісе, Баку, Архангельску, Уладывастоку магазыны «Торгсіну» адкрыты і ўжо разгарнулі работу.

Эканамічны савет пры СНК БССР ухваліў плян работы «Торгсіну» ў Беларусі і прапанаваў усім арганізацыям аказаць «Торгсіну» належную дапамогу.

Паведамленьні

— 11/IX, у 7 гадз вечр., Гарпраўленьне саюзу працаўсьветы склікае ў доме Працаўсьветы агульны зьлет усіх ударнікаў асьветнікаў г. Менску. Яўка ўсіх асьветнікаў абавязкова.

— Менгарсаветам СВБ выклікаецца на нараду на 11-га верасьня, у 7 гадз. вечр., наступныя т. т.: Доўгаполаў, Жолкевіч, Зарэмскі, Сяліцкі, Астапоўскі Станкевіч, Булат, Радкевіч, Гохмаер, Анжэйк., Мэтжэ, Міклуш, Расьпішэўскі, Раманоўскі, Вішнеўскі, Відунас, Нурпова, Квяткоўскі, Анжыеўскі, Вакшэвіч, Камінская, Старповіч, Віткоўскі.

Арг. аддзел ЦКК КП(б)Б просіць наступных членаў партыі: 1) Акулёнка, б. старшыню Чарэйскай КК-РСІ. 2) Мілера, б. старшыню Заслаўскай КК-РСІ, 3) Злотнікава, б. заг. БС Круглянскай КК-РСІ, 4) Гольдбэрга, б. заг. БС Юравіцкай КК-РСІ, 5) Май, б. заг. БС Чарэйскай КК-РСІ, 6) Трафімава, б. інспэктара Кохнаўскай КК-РСІ, 7) Ялсьнікоўскага, б. інспэктара Чачэвіцк. КК-РСІ, 8) Лашакова, б. інспэкт. Высачанскай КК-РСІ паведаміць Арг. Аддз. ЦКК КП(б)Б ад месцы знаходжаньня і выконваемай працы. Т. т., якія знаходзяцца ў г. Менску зайсьці асабіста.

ЧЫРВОН. ЗЯРКА — Пач. 7; 8-45 і 10-30 — ЦІХІ ДОН наст. фільм у 7 частках — ЗВЫШ ПРАГРАМЫ — „БУРЛЕСЬНІК" у 1 частцы.

„КУЛЬТУРА" — Пач. у 7; 8-45; 10-30 — Буйны мастацкі заменны фільм Шчасьце матулі Краузэ

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Адкрыта з 12 гадз. дня — ПОЛА НЭГРЫ ў карціне КАЛЮЧЫ ДРОТ

„ЮНЫ ПІНЭР" (будынак кіно „Культура") — Вядомы артыст Бэстаў у карціне ЗАКОН ГОР

ПРАЛЕТАРЫ — Адкр. з 12 г. дня. — ПАДАЗРОНЫ БАГАЖ прыгодн. фільм у 6 частках. Звыш праграмы палітасьветфільм фабрыка-кухня

„СПАРТАК" — Пач. 7-15; 9 і 10-45 Касы—з 8 гадз.) — З 11 верасьня выдатны фільм = ПУРГА = драма ў 7 частках

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА.

12 верасьня, у 7 гадзін вечара

СХОД МЕНСКІЯ АСЯЦЫЯЦЫІ ПРАЛЕТАРСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ.

Пытаньні:

1. Рэалізацыя сацыялістычнага дагавору менскага камсамолу з МенАППА'м.
2. Выстаўка «Пісьменьнік і сацыялістычнае будаўніцтва».

Запрашаюцца ўсе пісьменьнікі, прадстаўнікі: камсамольскіх арганізацый калектываў, Менгаркому КСМ, „Чырвонай Змены", „Рабочего", „Зьвязды", „Савецкай Беларусі" і члены літгурткоў прадпрыемстваў.

РАБФАК Імя Галадзеда ў Горках

паведамляе, што ІСПЫТЫ новапаступаючым канчаюцца 20-га верасьня.

Усе падаўшыя дакументы павінны зьявіцца на ІСПЫТЫ.

Да гэтага часу рабочыя і калгасьнікі, якія маюць асьвету за 2 курсы рабфаку, могуць падаваць дакументы на III-ці курс рабфаку.

Дырэктар рабфаку ЦІТАВЕЦ.

На 12 верасьня, у 7 гадз. веч. НАРКАМПРАЦЫ БССР (у габінэце наркома—Чырвонаармейская вул., № 16, 3-ці паверх)

СКЛІКАЕ

пашыраную нараду,

па пытаньні ўвядзеньня уніфікацыі і прэміяльна-зьдзельнай аплаты працы ў кіраўнічым і рахунковым апараце,

з наступным парадкам дня:

1) Становішча і бліжэйшыя задачы кіраўнічага апарату ў народнай гаспадарцы
а) даклады з месц ніжэйпералічаных арганізацый аб становішчы справаздачнасьці;
б) абгаварэньне праекту Наркампрацы па практычным ажыцьцяўленьні новых форм і мэтадаў працы кіраўнічага апарату.

На нараду запрашаюцца кіраўнікі ўстаноў, дырэктары, галоўбухі (абавязкова), рацыяналізатары і прадстаўнікі ТНБ наступных прадпрыемстваў і устаноў: зав. імя Вершылава, „Большавік", „Кастрычнік", „ДА", НКФ, Лесбелу, Белкаапсаюзу, Белсельтрасту. Менскай канторы Дзяржбанку. Таксама запрашаюцца прадстаўнікі НК РСІ, ЦСПСБ, Дзяржплану і рэдакцый газэт.

Нарком працы БССР Бакшін.

Менгарпрафсавет сёньня, 11-га верасьня г.г. у 6 гадз. увечара, у клюбе Саўгандальслужачых (рог Камуністычнай і Энгельса)

СКЛІКАЕ

агульна-гарадзкі сход прафактыву.

ПАРАДАК ДНЯ:

Вынікі пленуму ЦПСБ і задачы прафарганізацый Менску ў справе рэалізацыі сандагавору, заключанага з Заходняй вобласьцю.
Пасьля дакладу мастацкая пастаноўка.
Білеты атрымаць у ГСПС.

12 верасьня, у 7 г. веч. у Доме Працаўсьветы (Камуністычная, 19)

АДБУДЗЕЦЦА

аб'яднанае пасяджэньне калегіі НКА і прэзыдыуму ЦП працаўсьветы

ПАРАДАК ДНЯ:

Мерапрыемствы па рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе.

На пасяджэньне запрашаюцца: прафактыў саюзу працаўсьветы, заг. школ. тэхнікумаў і ВНУ, прадстаўнікі фабкомаў і аўкомаў тых фабрык і заводаў, да якіх прымацаваны школы, прадстаўнікі рэдакцый газэт і прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ і гаркому ЛКСМБ.

Згодна пастановы СНК СССР ад 21-VI—1931 году і загаду ВСНГ СССР ад 11-га ліпеня 1931 году № 49,

Беларускі Лесатэхнічны Інстытут

абвяшчае набор студэнтаў на 3-ці КУРС інстытуту на аддзяленьні:

леса-эканамічнае,
леса-культурнае і
леса-эксплёатацыйнае.

На 3-ці курс прымаюцца асобы, якія ня маюць скончанай вышэйшай асьветы і працуюць у галіне лясной прамысловасьці.

Прыёму не падлягаюць асобы, якія навучаюцца ў іншых ВНУ.

Усе паступаючыя на 3 курс будуць трымаць іспыты ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі 3-га курсу.

Да заяў неабходна дадаць усе дакументы, патрэбныя для паступленьня ў ВНУ, згодна даведніка НКА БССР, 2 фатаграфічныя карткі і на 50 кап. пашт. марак.

Заявы прымаюцца да 25-га верасьня 1931 году ў гор. Гомелі, канцылярыя Лесатэхнічнага інстытуту.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Даводзіцца да ведама ўсіх навуковых працаўнікоў БДУ і Вышэйшага Пэдінстытуту, што сёньня, 11 верасьня, у 6 гадз. вечара адбудзецца

СХОД навуковых працаўнікоў БДУ,

а 12 верась